# ЗМЕНЕНЫ ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ ЦЭНАЎ НА МЕДЫКАМЕНТЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўказам № 621 ад 11 снежня ўнёс дапаўненні ва ўказ ад 11 жніўня 2005 года № 366 «Аб фарміраванні цэнаў на лекавыя сродкі, вырабы медыцынскага прызначэння і медыцынскую тэхніку».**

Неабходнасць унясення дапаўненняў абумоўлена тым, што да гэтага часу не быў устаноўлены парадак фарміравання цэнаў на лекавыя сродкі і медыцынскія тавары ў выпадку прадастаўлення фінансавых скідак айчыннымі арганізацыямі-вытворцамі аптовым пакупнікам краіны.

Унесеныя дапаўненні ва ўказ № 366 дадуць магчымасць айчынным вытворцам прадастаўляць фінансавыя скідкі на тых жа ўмовах, што ўстаноўлены для нерэзідэнтаў Беларусі, якія імпартуюць лекавыя сродкі.

Увядзенне такога механізма павінна павысіць зацікаўленасць аптэчных структур, у першую чаргу недзяржаўных, у набыцці медыцынскіх тавараў айчыннай вытворчасці.

Атрыманне фінансавых скідак ад айчынных вытворцаў пры закупцы лекавых сродкаў дасць магчымасць прадпрыемствам сістэмы «Фармацыя» кампенсаваць страты нерэнтабельных сельскіх аптэк, а таксама страты ад прыгатавання лекавых сродкаў у аптэках.

Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Падрабязнасці

# ЗАМЕЖНІКІ-БРАКАНЬЕРЫ ЗАПЛАЦІЛІ СПАЎНА. АДНАК КРОПКА ЯШЧЭ НЕ ПАСТАЎЛЕНА

**У нумары за 9 снежня мы паведамлялі пра два падобныя здарэнні з замежнымі паляўнічымі, якія з розніцай у некалькі дзён і ў розных месцах незаконна здабылі разам трох зуброў.**

На сёння грамадзянін Германіі, які пры правядзенні загоннага палявання ва ўгоддзях Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» памылкова падстрэліў самку зубра, пералічыў на рахунак турыстычнай фірмы суму нанесенай шкоды і штрафныя санкцыі па кантракце агульным памерам 70 тысяч еўра.

Грамадзянін Францыі, які таксама падчас загоннага палявання незаконна здабыў самку і цяля зубра са статку страхавога генафонду на тэрыторыі Нацыянальнага парку «Прыпяцкі», добраахвотна пакрыў нанесеную прыродным рэсурсам шкоду ў памеры 19,95 мільёна рублёў. Акрамя таго, ён правёў аплату кошту здабычы самкі зубра і цяляці згодна з прэйскурантам цэнаў на арганізацыю палявання для замежных грамадзян у пяціразовым памеры — 72,9 мільёна рублёў. Тым не менш у абодвух выпадках канчатковыя кропкі яшчэ не пастаўлены: адносна грамадзяніна Германіі Свіслацкі РАУС, адносна грамадзяніна Францыі — пракуратура Жыткавіцкага раёна разглядаюць магчымасць прыцягнення іх да крымінальнай адказнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# У ІМЯ НОВАГА ПАКАЛЕННЯ

*Міндароўя, ЮНІСЕФ і ЕС яднаюць намаганні ў захаванні здароўя маці і дзяцей на забруджаных тэрыторыях*

**Кожнае наступнае пакаленне з пункту гледжання эвалюцыі — больш дасканалае, а значыць, больш каштоўнае. Таму аберагчы патомства — задача архіважная. Праект «Дзеці Чарнобыля», ініцыяваны Прадстаўніцтвам ЮНІСЕФ у Беларусі і Міністэрствам аховы здароўя, прысвечаны захаванню здароўя жанчын і дзяцей на забруджаных тэрыторыях. Фінансавую частку бярэ на сябе Еўрасаюз. Агульныя аб'ёмы падтрымкі ацэньваюцца прыблізна ў мільён долараў.**

Праект, разлічаны на два гады, з'яўляецца працягам доўгатэрміновага гуманітарнага супрацоўніцтва з заходнімі партнёрамі. Асноўная яго задача — паляпшэнне якасці медыцынскага абслугоўвання дзяцей, моладзі і жанчын на тэрыторыях, якія пацярпелі ў выніку аварыі на ЧАЭС. Праект нацэлены на падрыхтоўку і павышэнне кампетэнтнасці спецыялістаў, якія аказваюць медыцынскую дапамогу на забруджаных тэрыторыях, — адзначыў **прадстаўнік ЮНІСЕФ у Беларусі Юрый АКСАМІТНЫ.** Ён зрабіў акцэнт на такіх аспектах праграмы, як фарміраванне здаровага ладу жыцця, прафілактыка шкодных звычак у падлеткаў, інфармаванне насельніцтва аб карысці ўжывання ёдаванай солі. Не менш важнае і садзейнічанне фарміраванню ўстановак пазітыўнага і ўсвядомленага бацькоўства, скіраванае на паляпшэнне ведаў і навыкаў па доглядзе дзіцяці, адносінах і гульні. Падчас рэалізацыі праекта на пацярпелых ад аварыі тэрыторыях будзе створаная сетка цэнтраў, дружалюбных моладзі. Апроч таго, будзе палепшана і аснашчанасць тамтэйшых устаноў аховы здароўя: на закупку сучаснага медыцынскага абсталявання плануецца скіраваць каля 650 тыс. долараў. Мяркуецца набыць, у прыватнасці, апараты штучнай вентыляцыі лёгкіх, інкубатары для нованароджаных, фетальныя маніторы (для дыягностыкі функцыянальнага стану плода і вызначэння жыццёва важных паказчыкаў маці). Такім абсталяваннем плануецца папоўніць 15 устаноў Брэсцкай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей. Як патлумачыла **Алена БОГДАН, начальнік аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзецям у структуры Міністэрства аховы здароўя,** выбіраліся тыя медыцынскія ўстановы, сярод пацыентаў якіх найбольшая колькасць пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС. Яна запэўніла, што дзеянне праекта распаўсюджваецца на ўсе звёны ланцуга (пачынаючы ад падрыхтоўкі спецыялістаў) і ў роўнай меры прадугледжвае доступ да паслуг і сельскага, і гарадскога насельніцтва.

— Праз два гады пасля рэалізацыі гэтага праекта супрацоўніцтва не спыніцца, — запэўніў **Жазэ Мануэль Пінту ТЭЙШЭЙРА, кіраўнік Прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Беларусі і ва Украіне,** — гэта толькі частка агульнай карціны.

Ён падкрэсліў, што з канца 2008 года Еўрасаюз настроены на пашырэнне і паглыбленне супрацоўніцтва з Беларуссю, у сувязі з тымі паляпшэннямі, якія назіраюцца ў краіне. Спадар Тэйшэйра нагадаў, што ў ЕС ёсць упаўнаважаныя структуры, што рэгулярна праводзяць пераацэнку сітуацыі ў краінах, з якімі супрацоўнічае Еўрасаюз. І дадаў: «Мы не адмаўляемся ад сваіх абавязацельстваў і настроеныя на пашырэнне супрацоўніцтва пры ўмове, што ў краіне будзе надавацца ўвага важным для нас галінам».

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

Падпіска-2010

# ЧЫТАЦЬ «ЗВЯЗДУ» І ГЛЯДЗЕЦЬ НОВЫ ТЭЛЕВІЗАР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Жыву я зараз у вёсцы, — збіваючыся, расказвае Марына Уладзіміраўна. — Адпрацавала 36 гадоў на сілікатным заводзе і выйшла на пенсію. Вырасціла дзвюх дачок. Старэйшая працуе на заводзе. Ёсць і ўнукі. «Звязду» выпісваю ўсё жыццё. Калі была маладая, чытала «Знамя Юности», а пасля неяк перайшла на «Звязду». Мне тут усё падабаецца. Вунь і пра здароўе гляджу, бо ногі пабольваюць, пра сад і агарод таксама. Чытаю рубрыку, дзе Янка Крук парады дае. А ўвогуле, уся газета падабаецца. Квітанцыі дасылаю пастаянна і на гэты месяц таксама даслала. Першы раз выйграла. Там, праўда, пыталіся, ці ў добрыя рукі патрапіць тэлевізар. Дык вы не хвалюйцеся, у добрыя. Унукам аддам, хай глядзяць.

— Мама вельмі хацела выйграць, — расказвае Наталля. — Газету атрымала пазнавата, не глянулі адразу. Пасля глядзім — і праўда, ёсць наша прозвішча.

Павіншаваць Марыну Гіль прыйшоў начальнік ідэалагічнага аддзела райвыканкама Аляксей Пановіч, а таксама ўсе супрацоўнікі пошты.

Убачыўшы, што «Звязда» разыгрывае такія падарункі, падпіску афармілі Тамара Іванаўна і Анатоль Іванавіч Залескія. Нашы новыя чытачы атрымалі бейсболкі і нататнікі з лагатыпамі «Звязды».

— Мы даўно хацелі паспрабаваць вашу газету выпісаць, — расказвае Тамара Іванаўна. — А тут такая падзея. Якраз нагода. Паглядзім, пачытаем што за вы.

Тэлевізар уручылі, і зноў у дарогу праз заснежаны застылы лес. Па дарозе мы паспелі заехаць і перадаць сувеніры для сваіх чытачоў у Маладзечне, Валожыне, Вілейцы і іншых раёнах. Так што, паважаныя чытачы, заходзьце на пошту, афармляйце падпіску і атрымоўвайце падарункі ад нас!




Алена ПАЖОГА і старшыня Абрубскага сельвыканкама Васіль АРЛОЎСКІ.




Вучні школы вёскі Абруб.

У вёсцы Абруб «Звязду» чакалі ў школе. Маленькі аднапавярховы будынак з печкамі ў кожным класе і вялікай колькасцю карцін, зробленых рукамі вучняў і настаўнікаў. Старшыня Абрубскага сельвыканкама Васіль Арлоўскі, вучні, суседзі і калегі настаўніцы беларускай мовы Алены Пажога сабраліся тут, каб павіншаваць пераможніцу.

— «Звязду» я выпісваю больш за 20 гадоў, — расказвае Алена Пажога. — Мне яе параіла выпісаць Альдона Пятроўна. Я тады яшчэ загадчыцай дзіцячага садка працавала. Я, памятаю, спытала, што за газета такая? А яна мне ўсё падпішыся і падпішыся. Наша сям'я падпісалася і мы ні кропелькі не шкадуем. А я пасля падбіла падпісацца сваю суседку Антаніну Чэславаўну. Дарэчы, пра тое, што я выйграла тэлевізар, мне сказала менавіта яна. Праўда, я нацэльвалася на халадзільнік. Але залішнім і тэлевізар не будзе. У нас сям'я пераважна мужчынская, і часам густы не супадаюць. І я ўжо сказала, што адзін тэлевізар будзе ў маім пакоі, і буду глядзець, што захачу.

Дарэчы, наша пераможніца Алена Станіславаўна мае траіх дзяцей і піша вершы. Іх неаднаразова можна было ўбачыць на старонках «Звязды». А нядаўна яна стала прыёмнай мамай. У сям'і Пажогаў з'явіўся хлопчык Арцём.

— Мы без «Звязды» нікуды, — расказвае наша даўняя падпісчыца з Абруба Антаніна Чэславаўна. — Бывае, пераблытае паштальёнка, укладзе газету ў іншую скрыню. Дык муж мой бунтаваць пачынае, маўляў, як гэта мы сёння без «Звязды». Газета на ўсе пытанні адказвае. Люблю чытаць «Простую мову» Доўнар. А таксама разглядаю фотаздымкі Клешчука. Ён, напэўна, не есць і не спіць. Усё толькі здымае. (Смяецца). У нас у чацвёртым класе чатыры хлопчыкі — іх таксама прывучаем да «Звязды»...

За ўтульнай, амаль хатняй размовай, розыгрышамі маек, кепак і нататнікаў ад «Звязды» час прайшоў імгненна. Памахаўшы нам рукой, Алена Станіславаўна і яе памагатыя панеслі скрыню з тэлевізарам дамоў. А мы ізноў у дарозе. Да новага розыгрышу!

**Настасся ЗАНЬКО.**
**Фота Уладзіміра ЗДАНОВІЧА.**

# ДЗЕНЬ ПАДПІСЧЫКА Ў ВАЛОЖЫНЕ

**У рэспубліканскі Дзень падпісчыка наша газета, акрамя іншых населеных пунктаў, завітала і ў Валожын. Каля 600 асобнікаў «Звязды» выпісваюць тут па горадзе і раёне. У гэты марозны снежаньскі дзень мы завіталі ў галоўнае паштовае аддзяленне горада, каб сустрэцца са старымі падпісчыкамі і знайсці новых. Кожны, хто падпісаўся ў той дзень на «Звязду», атрымаў ад рэдакцыі прыемны навагодні сувенір і каляндар на два гады.**

На першы квартал 2010 года афарміла падпіску Яўгенія Іванаўна Зайкоўская, якая чытае нашу газету ўжо больш за дваццаць гадоў. Як прызналася сама Яўгенія Іванаўна, у рэкламных акцыях ніколі не ўдзельнічала, але вельмі хацела б выйграць тэлевізар. Дарагая Яўгенія Іванаўна, абавязкова паспрабуйце — хто ведае, можа, у гэтым годзе пашанцуе менавіта вам. Мы з радасцю прыедзем у Валожын яшчэ раз!

Праз колькі гадоў да «Звязды» вярнулася і яшчэ адна наша падпісчыца — Зінаіда Андрэеўна Жэко. Яна жыве з унучкай, таму, атрымаўшы навагодні сувенір ад «Звязды», узрадавалася ўдвая: «Дзякуй вялікі! Будзе што ўнучачцы паказаць». У свае 65 гадоў Зінаіда Андрэеўна ўзгадала, што раней у нашай газеце вельмі любіла чытаць... пра палітыку. Таксама адна з любімых рубрык — «Хатняя энцыклапедыя», якую вельмі ўпадабала і нават рэгулярна рабіла выразкі. Спадзяёмся апраўдаць вашы спадзяванні і гэтым разам, шаноўная Зінаіда Андрэеўна. Вы таксама не прападайце, пішыце да нас у рэдакцыю. Мы заўсёды рады лістам ад чытачоў.

Далучылася да нас і Лідзія Адамаўна Медзінская, якая ўпершыню падпісалася на «Звязду». Маем надзею, што наша сяброўства будзе працягвацца доўга. Дзякуй за веру ў нас!

— Рэспубліканскі Дзень падпісчыка — заўсёды знакавая для нашага паштовага аддзялення падзея, — распавядае намеснік начальніка Валожынскага паштамта Людміла Шаўрэй. — Вітаем кліентаў і распавядаем, у якім плане будзе праходзіць Дзень падпісчыка. У канцы дня ўсе карткі, па якіх за дзень была афармленая падпіска, прымаюць удзел у розыгрышы прызоў. У «Звязды» заўсёды ёсць свой стабільны падпісчык, чытаюць газету рэгулярна.

Наперадзе новыя маршруты-сустрэчы з падпісчыкамі. Заставайцеся са «Звяздой»!

**Ілья ЛАПАТО.**

*Валожын — Мінск.*

Абзац

◢ Дэпутаты Мінгарсавета ўчора на 17-й сесіі прагаласавалі за забарону продажу прэйскурантнай гарэлкі, пладова-ягаднага віна, слабаалкагольных напояў і піва ў аб'ектах гандлю сталіцы пасля 22 гадзін, перадае БЕЛТА. Такая забарона ўводзіцца з 22.00 да 9.00 і распаўсюджваецца на ўсе аб'екты гандлю, за выключэннем продажу такіх напояў у разліў у пунктах грамадскага харчавання.

**◢ Тэхналогію выкарыстання ачышчаных ад зерня кукурузных пачаткаў у якасці паліва асвоілі тры гаспадаркі Калінкавіцкага раёна. З адходаў, якія раней ішлі на арганічныя ўгнаенні, цяпер атрымліваюць цяпло для абагрэву вытворчых і бытавых памяшканняў у СВК «50 гадоў БССР», «Дружба-Аўцюкі» і КСУП «Пруднікоўскі». У найбліжэйшы час такую тэхналогію пачнуць выкарыстоўваць яшчэ ў трох гаспадарках раёна. Згодна з папярэднімі падлікамі, для працы аднаго катла на працягу ацяпляльнага перыяду патрабуецца каля 8 т пачаткаў. Кожны год у раёне іх накопліваецца каля 2 тыс. тон.**

◢ Першы гэтай зімой смяротны выпадак, выкліканы пераахаладжваннем арганізма, зарэгістраваны ў Мінску. Учора мужчына без пэўнага месца жыхарства, якога медыкі выявілі ляжачым на вуліцы ў Мінску і даставілі ў бальніцу, памёр. У прыёмны пакой ён быў дастаўлены ў стане агоніі. Былі праведзеныя рэанімацыйныя мерапрыемствы, але выратаваць яго не ўдалося.

**◢ Жыхар Жодзіна загінуў пад коламі пасажырскага цягніка Мінск—Віцебск. Інцыдэнт адбыўся на станцыі Жодзіна 15 снежня. Мужчына кінуўся пад цягнік, каб закончыць жыццё самагубствам. На момант гібелі яму было 44 гады. Падрабязнасці высвятляюцца.**

◢ Гендырэктар Смаргонскага завода аптычнага станкабудавання затрыманы за атрыманне хабару. Ад дырэктара аднаго з камерцыйных прадпрыемстваў ён атрымаў $6 тыс. за спрыяльнае вырашэнне пытання аб зніжэнні кошту выкананых работ па вырабе абсталявання. Пракуратурай Мінска распачатая крымінальная справа.

**◢ Нецвярозы мінчанін з падробленымі дакументамі на кіраванне аўтамабілем спрабаваў збегчы ад супрацоўнікаў ДАІ на чужым аўтамабілі. Ён рухаўся на БМВ у раёне стэлы «Мінск — горад-герой» на перакрыжаванні праспектаў Пераможцаў і Машэрава. Яго спрабаваў спыніць супрацоўнік ДАІ, аднак мінчанін праігнараваў патрабаванні інспектара. Так як міліцыянер знаходзіўся ў той момант на пасту без службовай машыны, ён не змог праследаваць зламысніка і паведаміў пра яго іншым падраздзяленням ДАІ. На праспекце Пераможцаў аўтамабіль паспрабавалі спыніць супрацоўнікі Ленінскага АДАІ Мінска, аднак вадзіцель зноў не падпарадкаваўся патрабаванням міліцыянераў і працягваў рух з хуткасцю 120 км/г. Спыніць яго ўдалося толькі каля мікраараёна Вяснянка. Як выявілася, ён выпіў больш як паўбутэлькі гарэлкі, да ўсяго, вадзіцельскае пасведчанне належала яго бацьку, куды затрыманы наклеіў фотаздымак. Па факце праводзіцца праверка.**

## Поўны абзац

◢ Удзельнікаў традыцыйнага спаборніцтва па паяданні пірагоў у брытанскім Уігане пачалі правяраць на прымяненне «допінгу». Раней удзельнікам конкурсу было дазволена мачаць пірагі ў падліву, што палягчала працэс іх паядання. Аднак сёлета выкарыстоўваць соус забаранілі. Акрамя таго, да нагляду за спаборніцтвамі прыцягнулі спецыялістаў, якія правяраюць, ці не прымаюць удзельнікі мікстуру ад кашлю. Сутнасць у тым, што мікстура памякчае горла і можа паскорыць паяданне аднаго пірага на 2 секунды — такія вынікі далі тэсты, праведзеныя ў горадзе напярэдадні спаборніцтваў. Пірагі з мясам і бульбай да конкурсу павінны адпавядаць пэўным стандартам. Іх дыяметр — 12 см, а вышыня — 3,5 см.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**29 ДЕКАБРЯ 2009 г. в 7 часов 30 минут СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ЗАО «ВОЗВЫШЕННОСТЬ» ПО АДРЕСУ: г. МИНСК, пр-т НЕЗАВИСИМОСТИ, д. 16, КОНФЕРЕНЦ-ЗАЛ.**

**Повестка дня:**

1. Об утверждении Регламента работы ЗАО «Возвышенность» с реестром владельцев ценных бумаг.
2. Об утверждении Положения о порядке хранения, предоставления участникам (акционерам) для ознакомления документов ЗАО «Возвышенность».

С документами Общества, относящимися к повестке дня, можно ознакомиться в приемной Генерального директора ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 9.00 до 17.00.

Форма проведения собрания – очная. Форма голосования по всем вопросам повестки дня – прямая, открытая.

УНП 100088694

Ну і ну!

# І ПАЙШЛІ ПАКУПНІКІ НА ГУДОК...

Маляўнічыя абвесткі пра хуткае закрыццё ў сталіцы абутковай крамы і звязаныя з гэтым зніжкі на ўвесь тавар ажно да 70 працэнтаў доўгі час прыцягвалі ўвагу пасажыраў сталічнага метрапалітэна. На распродаж абутку адводзіліся шэсць дзён — з 15 па 20 снежня. Карэспандэнту «Звязды», які хацеў сумясціць прыемнае з карысным (падрыхтаваць матэрыял на тэму зніжак, а, калі пашанцуе, то і прыдбаць нешта для сябе) на «месца дзеяння» ўдалося патрапіць на другі дзень распродажу. Якім жа было маё здзіўленне, калі яшчэ на выхадзе з метро (у 10.20) я ўперлася ў хвост чаргі — прыкладна з сотню чалавек тупалі нага аб нагу побач з крамай, каб у яе патрапіць. Між іншым, пакупнікоў запускалі ў будынак маленькімі партыямі. На вуліцы было 20 градусаў марозу, але энтузіязму ахвотных набыць абутак па смешных цэнах можна было пазайздросціць. Тыя, хто прыйшоў на «шопінг» парамі, па чарзе грэліся на прыступках увахода ў метро, хоць, шчыра кажучы, там было ніколькі не цяплей, чым на вуліцы. Усіх цікавіла, ці сапраўды крама знізіла цэны на 70 працэнтаў? Асабліва нецярплівыя спрабавалі зазірнуць у вокны, разгледзець цэннікі. «Хутчэй за ўсё, падмануць. Знізяць цэны на абяцаныя 70 працэнтаў на нейкія кеды, якія нікому не патрэбныя, — разважалі пад вокнамі крамы дзве маладыя жанчыны. — Паглядзі, усе бяруць боты ў рукі і ставяць іх на месца. Напэўна, скінулі цэны на 10, максімум — на 20 працэнтаў». Зразумела, што часу стаяць у чарзе, нават выконваючы рэдакцыйнае заданне, у мяне не было, а тым больш не было жадання атрымаць абмаражэнне. Таму патрапіць унутр гандлёвага пункта так і не ўдалося. Затое вярнуўшыся ў рэдакцыю і зазірнуўшы ў інтэрнэт, я даведалася аб тым, што рабілася ў першы дзень акцыі. Калі верыць адавочцам, то пакупнікі сабраліся задоўга да адкрыцця крамы, каб аказацца сярод першых шчаслiўцаў. І як толькі крама адчыніла свае дзверы, натоўп хлынуў у памяшканне. Але выйсці назад людзі не маглі на працягу гадзіны, паколькі вялікая чарга падпірала ўваход з вуліцы. Праз пэўны час ізаляваных у краме людзей пачалі выпускаць праз чорны ўваход, аднак і там хутка ўтварылася чарга. Кажуць, што хтосьці нават выклікаў міліцыю...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

...У гэтай сітуацыі, падаецца, самы час задацца пытаннем, хацелася б спадзявацца, далёка не рытарычным. Зніжкі — гэта, безумоўна, добра і прыемна. Але ці сапраўды вартыя танныя боты тых ахвяраў, на якія мы гатовыя пайсці, прынамсі, не толькі ў фізічным, але і ў маральным плане... А калі б арганізатары абвясцілі, як гэта было нядаўна ў Расіі, каб пакупнікі прыйшлі па бясплатны тавар у ніжняй бялізне? Маўляў, дазволяць вынесці тавару столькі, колькі людзі змогуць вынесці у руках. Ну не ў дэфіцытныя ж савецкія часы жывём, ці я не маю рацыі?

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

На кантролі

# «ЧАХАРДЫ» З ПРАВЕРКАМІ НЕ БУДЗЕ...

Каментуючы пазіцыю КДК наконт правядзення праверак суб'ектаў гаспадарання, кіраўнік Камітэта падкрэсліў, што кантралёры ніякім чынам не зацікаўленыя ў знішчэнні нейкага канкрэтнага прадпрыемства. Наадварот, тыя прадпрыемствы, якія працуюць у прававым полі, могуць не баяцца прыходу кантралёраў: памылкі, дапушчаныя, напрыклад, па няведанню, атрымліваюць і адпаведныя «ацэнкі» — па іх кантралёры стараюцца накладваць мінімальныя штрафы. Зусім іншая рэч, калі выяўляюцца істотныя парушэнні, накшталт наўмыснага ўхілення ад платы падаткаў і збораў, незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, — у такім разе вінаватыя, як заявіў Зянон Ломаць, адкажуць «на поўную катушку».

> **«Выяўлены факт, калі студэнты ў якасці падстаўных асобаў знялі з рахункаў аднаго з камерцыйных банкаў мільярды рублёў. За паўгода 70 падстаўнымі асобамі было знята больш як 50 мільярдаў рублёў».**

Кажучы пра новаўвядзенні, старшыня КДК, у прыватнасці, спыніўся на змяненні падыходу да планавання кантрольнай і наглядной дзейнасці. Ён зазначыў, што планавыя праверкі суб'ектаў гаспадарання будуць прызначацца толькі з улікам аднясення іх да груп рызыкі. Пры гэтым праверкі будуць праводзіцца не часцей, чым раз на год для суб'ектаў, аднесеных да высокай групы рызыкі, раз на тры гады — да сярэдняй групы рызыкі і раз на пяць гадоў — да нізкай. Акрамя таго, побач з іншымі абмежаваннямі на правядзенне праверак уводзіцца двухгадовы мараторый для праверак зноў створаных суб'ектаў гаспадарання.

Праверкі будуць праводзіцца ў адпаведнасці з паўгадавымі каардынацыйнымі планамі, якія размяшчаюцца на інтэрнэт-сайце КДК да 15 снежня і да 15 чэрвеня (www.kgk.gov.by). Такім чынам, тут «галоснасць поўная, далей ужо няма куды», — заўважыў старшыня Камітэта. Між іншым, на першае паўгоддзе налета ў каардынацыйныя планы ўжо ўключаныя ўсе запланаваныя праверкі (36,8 тысячы праверак) і ўнясенне новых суб'ектаў у іх не прадугледжваецца. Зянон Ломаць праінфармаваў, што першапачаткова кантрольнымі і наглядными органамі было прапанавана правесці больш як 59 тысяч праверак. Так, Міністэрства па падатках і зборах прапаноўвала за першае паўгоддзе правесці амаль 20 тысяч праверак, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях — 10 тысяч, Міністэрства аховы здароўя — больш за 8 тысяч, МУС — 3,5 тысячы. «Аднак, згодна з зацверджаным планам, будзе праведзена 36,8 тысячы», — канстатаваў ён.

Значна палегчыць працу прадпрыемствам і тое, што дакументам на працягу каляндарнага года не дапускаецца правядзенне некалькіх планавых праверак аднаго і таго ж суб'екта. Планавыя праверкі аднаго суб'екта, які правяраецца, могуць ажыццяўляцца некалькімі кантрольнымі і нагляднымі органамі толькі ў форме сумеснай праверкі. Таксама не дапускаецца праверка кантрольнымі і нагляднымі органамі суб'екта па адным і тым жа пытанні за адзін і той жа перыяд. Да таго ж праводзіцца яна будзе за перыяд, які не перавышае трох каляндарных гадоў, што папярэднічаюць году, у якім прынята рашэнне аб назначэнні праверкі, а таксама за перыяд года, што закончыўся. Адметна і тое, што суб'ект, які правяраецца, прызнаецца добрасумленна выконваючым патрабаванні заканадаўства, пакуль не даказана іншае. А ў выпадку няяснасці ці недакладнасці прадпісанняў акта заканадаўства рашэнні павінны прымацца на карысць суб'екта. Дарэчы, аб прызначэнні планавай праверкі суб'ект, да якога прыйдуць з ёй, павінен пісьмова папярэджвацца не пазней як за 10 працоўных дзён да пачатку яе правядзення.

Што ж датычыцца няпланавых праверак, то вызначаны дакладныя крытэрыі, па якіх яны могуць прызначацца. У прыватнасці, падставай для іх можа стаць наяўнасць інфармацыі, якая сведчыць аб парушэнні заканадаўства ці фактах узнікнення пагрозы нанясення шкоды жыццю і здароўю людзей. Разам з тым, праверкі па ананімках праводзіцца не будуць. Яны, падкрэсліў Зянон Ломаць, не з'яўляюцца падставай для правядзення праверак, але могуць стаць падставай для правядзення аператыўных мерапрыемстваў. Такія ананімныя лісты, паводле звестак старшыні КДК, ёсць. Зрэшты, у Камітэт, па прызнанні яго кіраўніка, ананімных лістоў прыходзіць шмат, сярод якіх хапае і проста злых паведамленняў.

Каментуючы па просьбе журналістаў факт забойства касіра пункта абмену валюты ў Мінску, Зянон Ломаць лічыць недапушчальным эканомію кіраўнікоў прыватных банкаў на бяспецы сваіх супрацоўнікаў. «Трэба адзяваць наручнікі на кіраўнікоў банкаў, якія эканомяць на мерах бяспекі для сваіх супрацоўнікаў», — зазначыў ён. І дадаў, што эканомячы на бяспецы апошніх, некаторыя прыватныя банкі знаходзяць пры тым грошы на высокія зарплаты кіраўнікоў. Галоўны кантралёр таксама падзяліўся інфармацыяй наконт таго, што ў КДК ёсць звесткі аб парушэнні аднаго з банкаў, у якім вялікія сродкі здымаюцца падстаўнымі асобамі. «Выяўлены факт, — паведаміў ён, — калі студэнты ў якасці падстаўных асобаў знялі з рахункаў аднаго з камерцыйных банкаў мільярды рублёў. За паўгода 70 падстаўнымі асобамі было знята больш як 50 мільярдаў рублёў».

> **Прадпрыемствы, якія працуюць у прававым полі, могуць не баяцца праверак: памылкі, дапушчаныя, напрыклад, па няведанні, атрымліваюць і адпаведныя «ацэнкі» — па іх кантралёры стараюцца накладваць мінімальныя штрафы.**

Акрамя таго, на брыфінгу было заяўлена аб намеры КДК навесці парадак на рынку аўтазапчастак, дзе ў ходзе масавых праверак выяўляюцца значныя парушэнні. Зянон Ломаць, у прыватнасці, згадаў тое, што пры з'яўленні кантралёраў на рынку больш як дзве трэці гандлёвых пунктаў па продажы запчастак зачыняюцца, а прадаўцы знікаюць. На яго погляд, гэта і ёсць сведчанне таго, што тут таксама патрабуецца навесці парадак.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

# МАРОЗ І СОНЦА САДЗЕЙНІЧАЮЦЬ ЗНІЖЭННЮ АКТЫЎНАСЦІ ЎЗБУДЖАЛЬНІКАЎ ВРВІ І ГРЫПУ

**Пры сонечным і марозным надвор'і актыўнасць вірусаў, якія выклікаюць вострыя рэспіраторныя інфекцыі і грып, зніжаецца, расказаў выконваючы абавязкі дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра эпідэміялогіі і мікрабіялогіі кандыдат медыцынскіх навук Аляксандр Пяткевіч.**

Аднак, як падкрэсліў спецыяліст, адназначна сказаць, што марознае і сонечнае надвор'е, што ўстанавілася ў Беларусі, будзе садзейнічаць таму, што захварэлых на ВРВІ і грып будзе значна менш, нельга. І для гэтага ёсць сваё тлумачэнне. Холад прыводзіць да таго, што людзі менш бываюць на свежым паветры і часцей застаюцца ў памяшканнях, дзе вялікая скучанасць і шмат шанцаў заразіцца. Ды і прастудзіцца зімой значна прасцей, чым у цёплую пару года. Акрамя таго, у гэты перыяд, як правіла, арганізм чалавека зведвае недахоп вітамінаў, зніжаецца імунітэт. Гэтыя і іншыя фактары прыводзяць да таго, што падхапіць прастуду або ВРВІ значна прасцей, адзначыў субяседнік.

Аляксандр Пяткевіч даў некалькі простых і вядомых парад, якія могуць даць магчымасць засцерагчы сябе ад такой непрыемнасці, як ВРВІ або грып. У прыватнасці, трэба рэгулярна праветрываць памяшканне, часцей бываць на свежым паветры, умацоўваць імунітэт, а таксама прытрымлівацца здаровага ладу жыцця.

**БЕЛТА.**

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 8 студзеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчыкі могуць выйграць электрафены, пыласосы, тэлевізары, печ ЗВЧ і халадзільнік. Розыгрыш прызоў адбудзецца **11 студзеня 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 21 студзеня 2010 г.**

Дастаўку тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. Атрымаць прыз можна самастойна ў рэдакцыі **по 25 сакавіка 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 25 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 25.11.09.**
**Тэрмін правядзення гульні — з 25.11.09 па 30.03.10.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1597 ад 23.11.09, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**5 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ____________________
(аддзяленне сувязі)
____________________ **на I кв. або 1-е паўг. 2010 года**

**Хатні адрас і тэлефон** [ ] ____________________
(індэкс)

____________________

____________________

**Удачы ў розыгрышы!**

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ на газету** [ ] (індэкс выдання)

**ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»**

Колькасць камплектаў [ ]

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ____________________
(прозвішча, ініцыялы)
Куды ____________________
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

| ПВ | месца | літар |
|---|---|---|

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету** [ ] (індэкс выдання)

**ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»**

| Кошт | падпіскі | ________ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ________ руб. | | |

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ____________________
(прозвішча, ініцыялы)
Куды ____________________
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

17 СНЕЖНЯ 2009 г. ЧАЦВЕР
№ 48 (15602)

## ЗАПРАШАЕ ГАЛОЎНАЯ ЁЛКА КРАІНЫ...

**Навагодняе дабрачыннае свята для дзяцей з удзелам Прэзідэнта нашай краіны адбудзецца ў сталічным Палацы Рэспублікі 28 снежня.**

Яго ўдзельнікамі стануць 2379 дзяцей з усіх рэгіёнаў Беларусі: пераможцы раённых, абласных і міжнародных алімпіяд, творчых конкурсаў і спартыўных спаборніцтваў, лідары дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый, дзеці-сіроты, дзеці са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў, жыхары тэрыторый, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы, дзеці з сем'яў работнікаў органаў унутраных спраў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, якія загінулі ці сталі інвалідамі падчас выканання службовых абавязкаў.

Самай шматлікай на свяце будзе дэлегацыя сталічных установ адукацыі — 1570 дзяцей. Міншчына атрымала 300 запрашэнняў. І па 100 дзяцей будуць прадстаўляць усе іншыя вобласці. Для дзяцей, якія прыедуць у сталіцу з іншых рэгіёнаў, прадугледжана таксама наведванне Нацыянальнага тэатра оперы і балета.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «ШКОЛЬНЫЯ ХВАРОБЫ» ЗАРАБЛЯЮЦЦА... ДОМА

**ХТО вінаваты ў школьных хваробах? Што мы самі можам зрабіць для сваіх дзетак, каб ім было камфортна ў школе і каб яны заставаліся вясёлымі і здаровымі? Па парады для «школьных» бацькоў я звярнулася да загадчыцы аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Алы МАЛАХАВАЙ.**

### Ці правільна вы малых сабралі ў школу?

Дзякуючы беларускім вытворцам, сёння ў продажы ёсць зручнае для дзіцяці адзенне, і нават пры небагатых фінансавых магчымасцях можна падабраць дзіцяці касцюмчык пад любое надвор'е. Але ці ўсе бацькі звяртаюць увагу на этыкеткі на дзіцячых рэчах, на тое, з якога матэрыялу зроблена адзенне? Лепшымі для паўсядзённага нашэння будуць рэчы з натуральных матэрыялаў — баваўны, ільну, паўшэрсці. Да натуральных прыраўноўваецца і віскоза. У такім адзенні цела будзе дыхаць, і малыя не стануць пацець. А вось у рэчах з ненатуральных тканін дзіцяці будзе некамфортна, у сінтэтычных касцюмах у цёплае надвор'е горача, а зімой, наадварот, холадна, тканіны, якія не паглынаюць вільгаць, могуць наогул прынесці шкоду дзіцяці. Уявіце, малы набегаўся на перапынку і вымушаны потны сядзець на занятках — а пасля мы здзіўляемся, чаму дзеці прастуджваюцца. «Сінтэтычны касцюм недастаткова паветрапранікальны і гіграскапічны, ён не падыходзіць для паўсядзённага нашэння. Санітарнымі нормамі рэгламентаваны склад хімічных валокнаў для адзення школьнікаў, у касцюме гэты паказчык не павінен перавышаць 55 працэнтаў, а ў кашулі — 35. Прынамсі, на касцюмах з ненатуральных тканін пазначана, што яны святочныя», — заўважае Ала Антонаўна.

Асабіста я бачыла, як бацькі на школьных кірмашах набывалі касцюмчыкі з надпісам на этыкетцы «для ўрачыстых выпадкаў» як паўсядзённую форму для сваіх малых. І калі на другі касцюмчык вы ўжо не зможаце раскашэліцца, дык хоць паклапаціцеся пра тое, каб першы слой адзення вашых малых (кашуля ці блузкі) быў натуральным.

Другая бацькоўская памылка — набываць дзецям рэчы навырост. Ваш сынок патанае ў пінжаку, а ягоныя штонікі валочацца па зямлі? Тое, што гэта непрыгожа — не самае страшнае. Нязручна, няёмка сядзець у такім касцюмчыку. А калі дзіця ўвесь урок толькі і будзе думаць, як бы хутчэй вылезці з такога адзення, дык яму не да ведаў. Адзенне павінна быць мяккім, зручным, дазваляць дзіцяці свабодна рухацца.

Не варта набываць дзецям і абутак навырост. Калі туфлі большыя больш чым на паўпамера, гэта можа прывесці да няправільнага фарміравання дзіцячай ступні. Пажадана, каб дзіцячы абутак быў з натуральнай скуры. Калі вы не можаце сабе дазволіць дарагія пакупкі (дзіцяці мяняць абутак даводзіцца не менш чым раз у паўгода), можна абысціся больш таннымі вырабамі, а каб малому было камфортна, у такі абутак трэба ўкласці вусцілку з натуральнага матэрыялу (баваўняную ці лямцавую). Красоўкі — гэта выключна спартыўны абутак. Нельга, каб малыя сядзелі ў іх увесь дзень. Спартыўная форма абавязковая. Калі ў вашага дзіцяці заняткі па фізкультуры, не забывайцеся класці яму запасную майку, каб пасля фізічных нагрузак ён апранаў чыстую, сухую, а не нацягваў касцюм на мокрую ад поту.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

А які ранец у вашага дзіцяці? Дзе вы яго набывалі? Калі ў беларускіх крамах, дык ён адпавядае ўсім санітарна-гігіенічным нормам. Так, калі ў Расіі прынята, каб школьныя заплечнікі важылі не больш за кілаграм, беларускія ранцы для пачатковай школы не павінны важыць больш за 600 грамаў. Але ў нашых крамах можна набыць і больш лёгкую прадукцыю — часам па 400, а то і 300 грамаў. Прычым з надзейнага матэрыялу, з цвёрдымі спінкамі, часам перфараванымі, каб забяспечваць яшчэ і масаж спіны. Дарэчы, рамяні на ранцы павінны быць не вузейшыя за 4 сантыметры, з мяккімі пракладкамі, каб не націраць скуру, з рэгуляванай даўжынёй у адпаведнасці з ростам дзіцяці, раздымамі, каб зручней было надзяваць і здымаць ранец. Бацькам неабходна прасачыць, каб дзіця насіла школьны заплечнік на спіне, а не на адным плячы.

А яшчэ на такой экіпіроўцы павінны быць святлоадбівальныя элементы. На школьнай сумцы для самых юных вучняў абавязкова павінна быць маркіроўка «для малодшых класаў». Ёсць пэўныя абмежаванні па колькасці кішэняў, па памерах сумкі. Вы набылі малому больш «дарослы» ранец, больш умяшчальны? Дарэмна. «Малодшым школьнікам дастаткова ранца з двума аддзяленнямі і адной дадатковай кішэняй, каб там змяшчалася ўсё неабходнае для заняткаў, — заўважае загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. — Калі ж у ранцы будзе шмат разнастайных кішэняў, дзеці абавязкова знойдуць, чым іх запоўніць. Да 40 працэнтаў таго, што знаходзіцца ў ранцах малодшых школьнікаў, — тое, што ім на занятках у гэты дзень не патрэбна. І чаго там толькі не бывае: ад цацак да ўсялякіх рэчаў, часам ранцы раздуваюцца да неверагодных памераў. Між іншым, ноша школьніка павінна складаць 10 працэнтаў, ад яго ўласнай вагі. Што датычыцца падручнікаў, то і тут нам удалося дамагчыся, каб яны адпавядалі санітарным нормам. Так, у пачатковых класах падручнік не павінен важыць больш за 300 грамаў, а ў старэйшых — больш за 600. Праблема з вагой падручнікаў ужо знятая, але цяпер вельмі шмат навучальных даведнікаў па розных прадметах. Мы так прапануем вырашаць гэту праблему: весці заняткі такім чынам, каб дапаможнікі былі патрэбнымі толькі падчас урока і таму маглі б захоўвацца ў школе. Акрамя таго, разгрузіць ранцы магчыма, калі школьнікі будуць дамаўляцца паміж сабой, хто якія кніжкі нясе ў пэўны дзень,— аднаго падручніка на парту дастаткова. Школьную форму і прылады для заняткаў творчасцю таксама пажадана захоўваць у школе». Акрамя таго, што так і ранцы разгрузяцца, дык і дзеці заўсёды будуць гатовыя да заняткаў, бо яны нічога не забыліся дома.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)**

# А вам СЛАБО!

Гэтыя словы ўжо некалькі дзён запар гучаць у нашым інтэрнаце. Гэта ў нас на сёння, калі казаць сучаснай мовай, новая «фішка»: гульня, якая мае на мэце самыя смелыя ўчынкі. Я першапачаткова была не ў курсе ўсіх падзей, таму ўсе гэтыя дзівацтвы не выклікалі ў мяне нічога, акрамя ўсмешкі і кропелькі здзіўлення. Ужо пасля, калі мае сябры мне патлумачылі, што ўсё гэта — гульня, якая мае свае правілы, мне стала надта цікава разабрацца, у чым сэнс гэтай студэнцкай задумы, і наогул, адкуль яна ўзялася. Няўжо, падумалася мне, студэнтам няма больш чаго рабіць падчас сесіі? Тут і залікі ўжо пачаліся, і абароны курсавых, ды і экзамены ўжо зусім на носе.

Як паведамілі мне непасрэдныя ўдзельнікі і пачынальнікі гэтай гульні ў нашым інтэрнаце **Вольга і Дзіма** (ім заўсёды нешта такое прыдумваецца), задума пачалася з прагляду кінафільма **«Закахайся, калі ёсць смеласць»**, галоўныя героі якога таксама гулялі ў нешта падобнае. Плюс-мінус некалькі адрозненняў. Нашы ж малайцы-студэнты проста нешта перапрацавалі, дапоўнілі і ўвялі свае правілы. Напрыклад, яны гуляюць на пэўную рэч, ну проста вельмі-вельмі неабходную аднаму з удзельнікаў, каб быў стымул для шчырага выканання задання. І вяртаецца яна да свайго гаспадара толькі ў выпадку гарантаванага выканання ўсіх яго ўмоў. І яшчэ — калі ты пачаў гуляць, то без дай прычыны выйсці з гульні не маеш права. Трэба ісці да канца. Вось толькі пытанне, калі ён будзе, той самы канец — а гэта невядома. Фантазія межаў не мае...

Дык якія ж правілы ў гэтай студэнцкай забавы? Усё вельмі проста. Табе кажуць «А вам слабо...?» і даюць пэўнае «вар'яцкае» заданне, якое неабходна выканаць, каб атрымаць назад сваю любімую рэч. Прычым, заданні не абмяжоўваюцца інтэрнатам: уключаюцца і вуліца, і ўніверсітэт, і нават грамадскі транспарт. А пачалося ўсё з аднаго пакоя ў інтэрнаце, да якога пасля падключыліся іншыя — яшчэ і яшчэ, такім чынам сфарміраваўся даволі значны калектыў. Вядома ж, адміністрацыя інтэрната не ў курсе ўсяго, таму і паціскае плячыма, усміхаючыся ад чарговага выбрыку жыльца-студэнта, спадзеючыся, што гэта адзінкавы выпадак.

Прычым, наколькі мне вядома, такія гульні практыкуюць не толькі ў нашым інтэрнаце. Так забаўляюцца студэнты і з БНТУ, і з БДУ, і з Медуніверсітэта. Напрыклад, мой знаёмы **Васіль (БДУ, факультэт журналістыкі)** кажа, што і ў іх таксама практыкуюцца такія гульні. Толькі яны робяць грашовыя стаўкі. Так існуе большая гарантыя таго, што чалавек выканае заданне. Гэта, мабыць, адзіная розніца ў правядзенні гульні такога тыпу. А вось узровень вар'яцтва амаль што такі ж: і ў каханні выкладчыцам прызнаваліся, і на вахту ўладкоўваліся, толькі не ў інтэрнаце, а ў самім універсітэце, і трохі змянялі спецыфіку гэтай працы: рабілі нешта тыпу фэйс-кантролю ў начным клубе. Вядома ж, і па шапцы шмат атрымлівалі, але задавальнення ад гульні атрымлівалі шмат.

Зразумела, правілы перадаюцца толькі між сабой і толькі сваім, надзейным людзям. Мне таксама прапанавалі паўдзельнічаць у гэтай забаве, але ў мяне нешта смеласці не хапіла на такія насамрэч вар'яцкія ўчынкі. Я вырашыла паназіраць збоку...

### Пункт прызначэння першы — грамадскі транспарт

**Задача:** у аўтобусе маршруту нумар 100 (кірунак, мне падаецца, вядомы ўсім) ці нейкага іншага падысці да вадзіцеля і голасна, на ўвесь транспартны сродак, папрасіць падвезці да вуліцы Казінца, і галоўнае — каб амаль што да самай хаты, як на таксі, толькі за 600 рублёў (у студэнта больш і няма).

**Вынік:** першапачаткова — здзіўлены погляд кіроўцы аўтобуса, а пасля ўсмешка да вушэй; а вось пасажыры так і не зразумелі сутнасці жарту, таму толькі скоса паглядзелі ў бок смелага гульца.

### Пункт другі — гарадская плошча

**Задача:** прахадзіць, нават прамаршыраваць вакол помніка таварышу Леніну дзесьці каля гадзіны, пры гэтым выкрыкваць які-небудзь лозунг.

**Вынік:** спачатку здзіўленыя погляды мінакоў, пасля пытанні міліцыянераў, якія ніяк не хацелі зразумець сутнасці гульні, а таму і абяцалі адвезці туды, дзе гуляць у што-небудзь не будзе асаблівага жадання.

Пачуццё гумару трэба яшчэ распрацоўваць!

### Пункт трэці — універсітэт

**Задача:** *для дзяўчынкі* — прыйсці на заняткі з вялізным ружовым бантам, прычэпленым на такую ж вялікую гульку, трохі раскудлачаную, а таксама з адным нафарбаваным вокам і адной падкасанай калашынай у штанах і так пратрымацца ўвесь дзень;

*для хлопчыка* — з'явіцца на семінары з нафарбаванымі пазногцямі, жаночай прычоскай і жаночым адзеннем на сваё, пры гэтым умудрыцца падкласці выкладчыку-мужчыну ў партфель якую-небудзь рэч з жаночага карыстання (напрыклад, бялізну).

**Вынік:** напачатку — маўчанне аўдыторыі, а пасля дзікі рогат і мноства пытанняў і кпінаў, пасля якіх выкладчык прапаноўвае пайсці дадому, адпачыць і падумаць над сваімі паводзінамі, а назаўтра напісаць тлумачальную на імя дэкана.

### Месца дзеянняў чацвёртае — інтэрнат

**Задача:** падысці да вахцёркі і спытацца ў яе туалетнай паперы, у выніку забраць увесь рулон і пасля прыйсці яшчэ, узяць газету і пры гэтым загадкава адказваць на ўсе магчымыя пытанні (тыпу «Ну, не маляваць жа ж я на ёй збіраюся!» ці «Сваёй шкада, вось і вырашыў да вас завітаць»), а таксама пасярод ночы ўзяць вядро з анучай і швабрай, надзець на сябе халат прыбіральшчыцы і выйсці на інтэрнацкі калідор, пры гэтым сварыцца на кожнага, хто пройдзе побач, а ў выніку выліць вядро вады на падлогу і забыцца яе прыбраць.

**Вынік:** з раніцы суровы погляд выхавальніцы, якая паслізнулася на той вадзе, якую ўчора забыліся прыбраць, і не знайшла паперы ў месцы агульнага карыстання, хоць сама ўчора павесіла туды новы рулон.

### На будучае, самая шалёная думка...

**Задача:** заваліць экзаменацыйную сесію — усю і першы раз — і такім чынам здзівіць і прывесці ў шаленства ўсіх выкладчыкаў на факультэце.

**Вынік:** пераздаць усё пасля, але паралельна прыдумаць нешта новае, на што можна задаць усё тое ж пытанне **«А вам СЛАБО?»**

Што гэта — дзівацтва, якое ўзнікае ад няма чаго рабіць ці проста насамрэч умелы спосаб адпачыць і пасмяяцца? Няхай кожны сам для сябе зробіць выснову і сфарміруе стаўленне да гэтых фантазёраў з сапраўды вар'яцкімі, але такімі цікавымі задумамі. Галоўнае, каб пачуццё гумару нас не пакінула і мы яшчэ маглі і ўмелі смяяцца — шчыра, па-сапраўднаму.

**За студэнтамі-дзівакамі назірала студэнтка БДПУ імя Максіма Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.**

## ДЗМІТРЫЙ І БЭЦІ НЕ ПАДВЯДУЦЬ!

У Дэпартаменце аховы няма паблажак за нявопытнасць і ўзрост. Малады супрацоўнік Ушацкага аддзялення аховы Дзмітрый Кемстач гэта добра разумее і таму заўсёды добрасумленна ставіцца да сваёй працы, да выканання пастаўленых яму задач. Пасля службы ў арміі — а служыў Дзмітрый дэсантнікам — прайшоў хлопец спецыяльную падрыхтоўку ў навучальным цэнтры Дэпартамента аховы ў Мінскай вобласці. Потым стаў працаваць ва Ушацкім аддзяленні аховы. Адразу Дзмітрый быў прызначаны на пасаду міліцыянера — кінолага групы затрымання. Было гэта пазалетась. Дзмітрый тады атрымаў шчаня нямецкай аўчаркі. Нялёгка навучыць сабаку ўсім патрэбным спецыяльным навыкам і прыёмам, падрыхтаваць да працы. Дзмітрый здолеў — дзякуючы старанню і ўпартасці. Дапамаглі і вопытныя калегі.

Нядаўна разам раскрылі злачынства. У адзін з вечароў у раённы аддзел унутраных спраў паступіла паведамленне пра тое, што ў вёсцы Павулле ўчынілі крадзеж з крамы (яна не знаходзілася пад сігналізацыяй). Дзмітрый разам з Бэці ў складзе аператыўна-следчай групы прыбылі на месца. Бэці адразу ўзяў след злачынца. І спатрэбілася нямнога часу, каб затрымаць злодзея ў лесе, дзе ён хаваўся.

Як расказаў «Звяздзе» начальнік Ушацкага аддзялення аховы маёр міліцыі Уладзімір Чумакоў, яго падначалены Дзмітрый Кемстач, акрамя таго, што старанны супрацоўнік, яшчэ і добры спартсмен. На абласным чэмпіянаце па рукапашным баі сярод падраздзяленняў аховы заняў трэцяе месца. Удзельнічае ў турнірах па міні-футболе. І каманда, дзе ён гуляў, нядаўна заняла першае месца.

Наперадзе ў маладога міліцыянера і яго надзейнага напарніка яшчэ шмат выпрабаванняў, якія трэба паспяхова пераадолець. Вядома, яны не падвядуць, бо вельмі старанна служаць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**



# У ПАГОНІ ЗА КЛЯНОВЫМ ЛІСТОМ

## Размова з галоўным трэнерам алімпійскай зборнай Беларусі па хакеі і мінскага «Юнацтва» Міхаілам ЗАХАРАВЫМ



Фота Людмілы МІНКЕВІЧ.

У рэестры патрэбных якасцяў спартсмена харызма знаходзіцца далёка не на апошнім месцы. Згадзіцеся, толькі на добрай форме і квітку ад спадарыні Фартуны далёка не заедзеш. І, напэўна, у такія хвіліны камусьці не хапае жывасці асобы, духоўнай моцы, вытрымкі... Наша хакейная дружына калісьці, разлічваючы на доўгую алімпійскую вандроўку, выйшла ўжо на прамежкавым прыпынку, саступіўшы ўтульнае месца ў цягніку да Турына камандзе Латвіі. На той час зборную трэніраваў таленавіты і амбіцыйны Міхаіл Захараў. Сёння ён зноў на капітанскім мосціку алімпійцаў, праўда, узышоў на яго не чарговым зменшчыкам-татыстам, а харызматычным спецыялістам, з буйнымі перамогамі роднага «Юнацтва», уласным поглядам на развіццё айчыннага спорту і ўменнем ніколі не выклікаць абыякавасці да сваёй працы. Ужо хутка лядовая дружына накіруецца ў краіну кляновых лістоў, каб у чарговы раз пазмагацца за алімпійскі трафей, балельшчыкаў і ўласны аўтарытэт. Нас сапраўды чакае цікавая хакейная зіма.

Нягледзячы на тое, што праца са зборнай займае шмат часу, спадар Міхаіл цалкам аддае сябе рабоце і ў родным «Юнацтве». Каманда ідзе ў лідарах чэмпіянату, а тут яшчэ мінскім хакеістам кінуў выклік фінал Кантынентальнага кубка. Каб паспець вырашыць усе надзённыя пытанні, вядомы трэнер праводзіць на працоўным месцы амаль увесь дзень.

— Графік у мяне досыць шчыльны. І пасля прызначэння на пасаду галоўнага трэнера алімпійскай зборнай рабочыя гадзіны толькі дадаліся, — расказвае Захараў падчас нашай размовы. — Падымаюся я прыкладна а сёмай гадзіне раніцы, пасля займаюся фізкультурай і еду ў парк Горкага (офіс і лядовая пляцоўка ХК «Юнацтва». — **Т. Ш.**). Цяпер працы ў мяне вельмі шмат: праглядаю матчы, сачу за выступленнем нашых хакеістаў, размаўляю па тэлефоне як з НХЛаўцамі, так і з тымі, хто гуляе ў КХЛ.

***— Трэніроўкі «Юнацтва», зборная краіны... Ад падзеяў і пытанняў галава не ідзе кругам?***

— Ідзе, і найбольш ад адной вельмі важнай праблемы: абаронцы зборнай не маюць у клубах патрэбнай гульнявой практыкі, патрэбнага часу, які яны павінны праводзіць на пляцоўцы.

***— Цікава, і як вы збіраецеся вырашаць гэтую праблему?***

— У нас адна надзея — мінскае «Дынама». Шмат хакеістаў каманды Аляксандра Андрыеўскага з'яўляюцца кандыдатамі ў зборную. Таму было б вельмі добра падцягнуць абаронцам гульнявы графік. Мне вельмі хочацца, каб Радзінскі і Башко часцей гулялі за каманду. Гэтыя хлопцы спадабаліся мне яшчэ ў складзе «Шахцёра» (Салігорск). Пра іх я буду размаўляць з галоўным трэнерам «Дынама». У мяне з Андрыеўскім добры кантакт, таму спадзяюся, што гэтае пытанне хутка вырашыцца.

***— Са складу, які набіраў яшчэ Хэнлан на Кубак Палесся, вы выкраслілі 6-7 хакеістаў...***

— Гэтыя хлопцы вельмі перспектыўныя спартсмены. Аднак на Алімпійскіх гульнях патрэбны своеасаблівы сімбіёз майстэрства і характару. Таму хакеісты і не падышлі камандзе. Я нядаўна глядзеў запіс спарынгаў зборнай Германіі. Немцы гуляюць досыць жорстка, як кажуць, плячо ў плячо...

***— Падчас прэс-канферэнцыі вы адзначылі, што вам патрэбныя «мужыкі», якія будуць па-сапраўднаму змагацца на турніры.***

— У нас ёсць на каго абаперціся — гэта добра правераны касцяк зборнай. Паглядзі, Андрэй Касціцын у адным з апошніх матчаў НХЛ правёў на лёдзе шаснаццаць хвілін, што, безумоўна, вельмі добры паказчык.

***— Ці дакладна вядома, што беларусы, якія выступаюць у НХЛ, возьмуць удзел у Алімпійскіх гульнях у Ванкуверы?***

— Бясспрэчна, я на сто працэнтаў у гэтым упэўнены. Толькі яны прыляцяць ужо ў Канаду, на апошні збор каманды напярэдадні Алімпіяды, — і пасля невялічкай паўзы, — у нас няма амаль ніякіх пытанняў, звязаных з фізічнай формай хакеістаў або з кіраўніцтвам Федэрацыі. Яшчэ раз паўтаруся, галоўная праблема хаваецца ў недахопе гульнявога часу хакеістаў абароны.

***— На бліжэйшы трэніровачны збор у Славакіі былі выкліканыя тры варатары. Ці збіраецеся вы эксперыментаваць з галкіперамі?***

— Зразумела, што Мезін больш дасведчаны ў такіх спаборніцтвах за Коваля і Брыкуна, аднак Коваль цяпер паказвае такую гульню, што проста любата. І тут, вядома ж, трэба будзе разлічыць сілы, ведаць, наколькі кожны падрыхтаваны да матча.

***— У адным з апошніх інтэрв'ю ваш памочнік па нацыянальнай камандзе Андрэй Хамутоў адзначыў, што ехаць на Алімпіяду і не думаць пра змаганне за медалі гэта, маўляў, непатрэбная рэч...***

— А як жа? Праўда, я не збіраюся крычаць, што мы едзем у Ванкувер па ўзнагароды, але на кожную сустрэчу мы будзем ставіць максімальныя задачы.

***— Спадар Міхаіл, распавядзіце, калі ласка, пра вашае знаёмства з Хамутовым. Калі вы прапанавалі яму дапамагаць вам у зборнай?***

— Мы разам з Андрэем гулялі яшчэ за зборную СССР і заўжды былі ў добрых стасунках, тэлефанавалі адзін аднаму. І калі Андрыеўскі адмовіўся, а гэта было пасля выканкама федэрацыі, я патэлефанаваў Хамутову, і ён згадзіўся дапамагаць мне ў зборнай Беларусі.

***— Ці збіраецеся вы яшчэ запрашаць каго-небудзь у трэнерскі штаб каманды?***

— Паглядзім, яшчэ ёсць адно вольнае месца. Мы, дарэчы, дамовіліся з Дэйвам Льюісам, які нядаўна дапамагаў працаваць у нашай зборнай Глену Хэнлану.

***— Дык у вас атрымаўся сапраўдны інтэрнацыянальны трэнерскі склад...***

— І што тут дзіўнага? Льюіс сапраўдны прафесіянал, ён — пераможца трох Кубкаў Стэнлі. Усе кажуць пра яго толькі добрае. Аднак найбольш цікава ў ім тое, што Дэйв добра разбіраецца ў гульні ў абароне.

***— За апошнія пяць-шэсць гадоў вы прымусілі балельшчыкаў бачыць у сваёй асобе амбіцыйнага трэнера, які амаль заўжды вырашае задачы з добрымі вынікамі.***

— Так, і магчыма таму каля «Юнацтва» ўзнікае нейкая нервовасць. Камусьці можа і не падабаецца, што за шэсць гадоў мы чатыры разы перамагалі ў чэмпіянаце краіны, валодалі Кантынентальным кубкам... За ўсе нашыя перамогі я ўдзячны кіраўніцтву горада, якое заўжды падтрымлівае нашыя ініцыятывы. Што да вынікаў, то яны насамрэч надзвычайныя. Я зараз узгадваю: які моцны тады быў «Керамін», а якім «монстрам» быў «Гомель? А якія хакеісты гулялі за гэтыя каманды? І мы ўсё адно здолелі перамагчы іх. Узгадваю і нашую перамогу ў Кантынентальным кубку над омскім «Авангардам». Гэта была каманда зорак, «хакейных мільянераў». Перамога была для нас амаль нерэальным вынікам. Аднак з лікам 2:1 па булітах перамагло «Юнацтва».

***— Вы не першы год ставіце пытанне пра ўдзел вашай каманды ў КХЛ. Будзеце змагацца да апошняга?***

— Ведаеш, удзел «Юнацтва» ў КХЛ патрэбны не толькі мне, але і ўсёй краіне. Проста трэба ў пэўны момант разам з федэрацыяй сесці за стол і выпрацаваць план развіцця на найбліжэйшыя чатыры гады. Трэба спрабаваць уключыць у КХЛ і «Гомель». Там наогул вельмі любяць хакей, і гораду, як мне здаецца, неабходны новы лядовы палац на сем тысяч гледачоў. Гэта датычыцца і Бабруйска. Будзе дрэнна, калі горад з такой арэнай не будзе мець прадстаўніка ў КХЛ. Беларусі неабходна мець тры-чатыры каманды ў гэтай лізе.

***— Сярод балельшчыкаў існуе меркаванне, што расіяне проста не дазволяць, каб у беларусаў было столькі камандаў у сваім чэмпіянаце.***

— Можа і так, толькі я думаю, што гэтым пытаннем трэба займацца цяпер, а не праз некалькі гадоў, калі магчымасць удзелу ў Кантынентальнай лізе для іншых айчынных камандаў, акрамя «Дынама», можа быць сапраўды мізэрнай.

***— «Дынама» ў хуткім часе пераедзе на новы хакейны стадыён. Можа, вы збіраецеся замест іх праводзіць свае хатнія матчы ў Палацы спорту?***

— Гэта пытанне разглядаецца, аднак пакуль нічога яшчэ не вырашана. Праўда, нам сапраўды хочацца пераехаць на новую, больш камфортную пляцоўку.

***— За мінскае «Дынама» цяпер выступаюць вядомыя легіянеры, якія выступаюць і за зборныя сваіх краін. А як вам узровень гульні замежнікаў, якія прыязджаюць на чэмпіянат Беларусі?***

— Наш чэмпіянат стаў слабейшы, чым раней. Таму вельмі добра, што да нас прыязджаюць легіянеры; напрыклад, Кулакоў і Балмачных, якія гуляюць за салігорскі «Шахцёр», дэманструюць вельмі добры хакей.

***— А ў «Юнацтве» легіянеры, чамусьці, надоўга не затоюцца.***

— У нас каманда, дзе ад хакеістаў заўжды патрабуюць вынікаў. Напэўна, толькі Шыткоўскага, калі ў яго быў гульнявы крызіс, мы не чапалі, бо ён шмат зрабіў для нашай дружыны. Ты называеш прозвішчы легіянераў: шведа Эрыксана, амерыканца Лоўсана... Гэта таксама добрыя хлопцы, проста нешта не склалася ў іх у нашай камандзе.

***— Сёння «Юнацтва» — гэта не толькі моцная дарослая каманда, але і вельмі вядомая хакейная школа. Які ўнёсак маладых хакеістаў, выпускнікоў школы, у сённяшнюю гульню каманды?***

— Яны павінны выглядаць крышачку лепш у матчах за дарослую каманду... Аднак усё роўна яны кожны год з'язджаюць у Канаду гуляць у юніёрскай хакейнай лізе. Я гэтага крышачку не разумею: навошта ехаць адразу ў Канаду, калі можна прагрэсаваць у матчах роднага першынства з ужо сталымі хакеістамі? Вось прыклад Стэфановіча і Касціцына, якія спачатку гулялі на радзіме і толькі пасля паехалі за акіян. На маю думку, гэта самы правільны варыянт.

***— Як вы лічыце, на гэты момант ваша хакейная кар'ера ўжо больш-менш склалася?***

— Мяркую, што так. Я нядрэнна пагуляў, шмат разоў перамагаў як трэнер. Але мне вельмі хочацца папрацаваць і на Алімпіядзе, гэтыя спаборніцтвы мяне вельмі цікавяць.

***— А хто быў вашым духоўным бацькам, каб у любы час падбадзёрыць, параіць нешта, чаго вам не хапала ў дзеяннях?***

— Гэта Уладзімір Васільевіч Крыкуноў. Мне пашанцавала ў знаёмстве з ім. Аднак ён не толькі мне, але і ўсяму айчыннаму хакею даў шмат карыснага. Менавіта ён, сярод іншых трэнераў, з'яўляецца для мяне добрым прыкладам настаўніка, які заўжды прыносіць сваёй працай добрыя вынікі. Ён даў мне калісьці добрую параду: нічога не палохацца і смела ісці наперад. Гэтыя словы дапамагаюць мне і цяпер. Шкада, што ў яго не атрымаецца папрацаваць на Алімпіядзе ў трэнерскім штабе Беларусі.

***— А ў вас не бывае жадання пасля матча альбо трэніроўкі нешта параіць сыну Канстанціну, які таксама гуляе за «Юнацтва», паказаць на яго памылкі?***

— Пра яго цяпер шмат пішуць у друку, але для мяне ў калектыве ўсе роўныя. Аднак калі хакеіст хоча нечага дасягнуць, то павінен і сам дадаткова працаваць. Мне распавёў Міша Грабоўскі, што ў канадскай камандзе «Таронта» пасля трэніроўкі маладыя гульцы яшчэ гадзіну асобна працуюць на лёдзе.

***— Праўда, што з хакеістамі вы працуеце, выкарыстоўваючы метад «пугі і перніка»?***

— Не, толькі пернік *(усміхаецца)*.

***— А на гульцоў не зрываецеся?***

— Толькі зрэдку. Бывае, што хакеіст па нейкіх прычынах гуляць не можа, і ў такі момант трэба зрабіць правільныя высновы. А хакеісты ў камандзе добрыя, я ўсіх іх паважаю.

***— Я чуў, што з'явілася ідэя заснаваць кабельны канал, прысвечаны беларускаму хакею. Калі б вам прапанавалі выступіць падчас трансляцыі ў ролі эксперта, згадзіліся б?***

— Ну, не ведаю. Напэўна, згадзіўся б. Толькі ў нашай краіне хапае добрых каментатараў, каментуюць не горш за расіяніна Маёрава...

***— Дык Маёраў у мінулым вядомы хакеіст...***

— А ты паглядзі і паслухай, як у нас каментуе Навіцкі. І пасля скажы, што ён не гуляў у хакей.

***— Неяк мы заўважылі вас на выставе беларускага мастака Андрэя Смаляка...***

— Ён вельмі добры мастак. Дарэчы, менавіта на той выставе мы з ім і пазнаёміліся.

***— А што вам найбольш падабаецца ў выяўленчым мастацтве?***

— Я люблю пейзажы, з такімі калматымі дрэвамі і старымі замкамі, — крыху задумваецца. — А яшчэ збіраюся на балет схадзіць. Памятаю, як дваццаць гадоў таму хадзіў на балет «Спартак»: ён мне вельмі спадабаўся. У ім столькі мужнасці, драматызму... А цяпер пайду на «Лебядзінае возера». Гэта таксама шэдэўр...

**Тарас ШЧЫРЫ.**

## Рэверс з сеціва

### ПЕСНЯ ПРА ШЧЫРАСЦЬ, ЦІ ЯК ЗАРАБІЦЬ У ПЕРАХОДЗЕ

*3 снежня 2009 года*



***Калі ў вас няма грошай, ведаеце, якая самая распаўсюджаная парада — як іх зарабіць? Пайсці спяваць у пераход. Гэта ўжо нейкі штамп і жарт адначасова. Але, як высветлілася, гэта яшчэ і сур'ёзны бізнэс...***

**Надзея Валькоўская.**

@

*Чаму наогул так негатыўна ставяцца да падобнага заробку? Сапраўды, у Еўропе ці нават у Расіі, не толькі працей так зарабіць, але ж і іншым паглядзець на ўсялякіх народных майстроў прыемна. Шмат талентаў ёсць, а часам пра іх і не ведае ніхто...*

**інквазія.**

@

*Спяваць — нядрэнна... Але ёсць куды лепшыя і больш карысныя для людзей сродкі заробку. Не трэба прывіваць моладзі звычку да пошуку простых шляхоў і лёгкіх грошай, і больш за тое — жабравання і гультайства. Іншых варыянтаў хапае і, нягледзячы ні на што, падзарабіць можна. Мяркую па сваёй дачцэ: яна працуе ў краме тры дні на тыдзень, у першай палове дня...*

**Спадар.**

@

*Зусім і не лёгкія тыя грошы... Сядзець у цёплай краме, у аддзеле, куды завітае некалькі пакупнікоў у гадзіну, значна лягчэй, чым спяваць у пераходзе, асабліва калі на двары холад ці гарачыня. Да таго ж, даваць ці не даваць грошы — справа выключна добраахвотная. А калі сваё майстэрства паказвае чалавек, які мае што паказаць, то і грошы пакідаеш з задавальненнем. Я лічу, што такі спосаб заробку нічым не абражае чалавека. Ён жа не сядзіць з працягнутай рукой. Ён прадае сваю працу, свой талент. А гэта каштуе грошай. Да таго ж, наяўнасць такіх людзей робіць жыццё больш разнастайным. Няхай яны будуць.*

**Юрась.**

@

*Я таксама лічу, што гэта зусім не гультайства і жабраванне. Няўжо гультаямі ці жабракамі можна назваць вандроўных цыркачоў альбо менестрэляў? Няўжо лепш піць піва і «тусавацца»? Вельмі няправільна забараняць гэта адміністрацыйна. Тым больш, што не дапаможа — і не трэба.*

*Аднойчы бачыў, як нейкі юнак спявае ў пераходзе на беларускай мове. Вельмі добрая рэклама. І дадатак да новай дзяржаўнай палітыкі.*

**Аляксандр.**

*А чаму б не звярнуцца да кіраўніцтва студгарадка па інфармацыю, да прарэктара, які курыруе гэтыя пытанні? Ці інфармацыя школьнікаў больш грунтоўная, праўдзівая, аб'ектыўная? Задача журналіста такога ўзроўню — даць чытачу ўсебаковую поўную інфармацыю, а высновы чытач зробіць сам...*

**Вадзім Грачоў.**

@

*Ага, давайце, выгароджвайце сябе))))))))))) Усё гэта праўда!!!!!!!!!!!!!!!!!!!!!!!!!!!!!*

**Ганна.**

@

*Яўген, вы малайчына, што напісалі гэта!*

**Яна.**

@

*На жаль, СТАРШЫНЯ ПРАФКАМА СТУДЭНТАЎ БДПУ, гэта менавіта так, як і напісана!!! Наша загадчыца, Валянціна Іванаўна, выкінула мой халадзільнік на сметнік!!! І дзякуючы ёй, на найбліжэйшы час свайго існавання я засталася без яго, а бацькі мне яго не купяць, таму што ў мяне іх НЯМА!!!!!!!!!!!!! Для пачатку праводку памяняйце, а потым ужо «Атланты» з 2000 года прасіце!!!!!!!*

**Ганна.**

@

*Самае незразумелае ў гэтай сітуацыі тое, чаму так мала каментараў з боку кіраўніцтва ўніверсітэта. Таго ж студгарадка. Гэта неяк непрафесійна. Няма двух поглядаў на сітуацыю. І было б нядрэнна каментар юрыста ўзяць. Таму што, наколькі я ведаю, такая самая сітуацыя назіраецца і ў іншых універсітэтах. Напрыклад, у БНТУ...*

**Леначка.**

@

*Я з вамі, спадар Грачоў, не згодна. Пражыўшы ў інтэрнаце некалькі гадоў, я не чакала ад кіраўніцтва інтэрната такога стаўлення. Няўжо вы думаеце, што студэнты такія багатыя, каб набываць сабе адносна новыя халадзільнікі? Няхай завядуць сабе майстра, які будзе кантраляваць тэхнічны стан халадзільнікаў. Можа, яму ўжо 20 гадоў, але працаваў ён 4 гады. Да таго ж у інтэрнатах забараняюць усё, што можа нашкодзіць інтэрнату... Напрыклад, абагравальнікі... Чаму тады пакоі не забяспечваюць цяплом? Абагравальнікі новыя масляныя, якія па ўсіх фармулярах праходзяць гранічныя ўмовы ТБ. Пакажыце нам закон, які забараняе нам (студэнтам) карыстацца паслугамі ў памяшканні, за якое мы ПЛАЦІМ! Калі ў вас ад перанапружвання грэецца праводка — зрабіце ў будынку бяспечную электраправодку. Я не думаю, што наш будынак пройдзе сапраўдную праверку па ТБ. Усё ў такім стане, што там немагчыма жыць. Па ўсіх мерках мы павінны знаходзіцца ў памяшканні ў футрах, піць халодны чай, чытаць у цемры кнігі і набываць прадукты толькі на адно прыгатаванне. А вы самі пагадзіліся б так жыць? І якое права вы маеце выкідваць НАШЫ АСАБІСТЫЯ РЭЧЫ? Гэта парушэнне нашых правоў! Няўжо нельга было іх проста адключыць, забраць на склад (для далейшага вяртання)... Але не выкідваць жа!!! Зараз, магчыма, педагагічны савет кампенсуе кошт урону? Гэта, між іншым, адміністрацыйная адказнасць!!! Я не давала сваёй згоды на вынас МАЙГО халадзільніка! Дзе мне захоўваць прадукты? Падлічыце кошт новага халадзільніка! Мы не ў сілах дазволіць сабе такое! Жыць у халодным, сырым памяшканні, з прусакамі, харчавацца ўсухамятку, дыхаць сырасцю, мерзнуць пастаянна... А вы б адправілі сваю дачку ў такія ўмовы?*

**Студэнтка БДПУ.**

Сайт «Звязды»: www.zviazda.by

### НАШЫ ХАЛАДЗІЛЬНІКІ ВЫНЕСЛІ НА СМЕТНІЦУ, ІХ ПАРАСЦЯГВАЛІ БАМЖЫ

*9 снежня 2009 года*



***Кіраўніцтва інтэрната БДПУ № 2 з такім імпэтам змагаецца за энергазберажэнне, што ахвярай стала асабістая бытавая тэхніка студэнтаў. Электрачайнікі і абагравальнікі канфіскавалі, а халадзільнікі проста выкінулі...***

**Яўген Валошын.**

@

*Я — старшыня прафкама студэнтаў БДПУ. Скончыў БДПУ ў 2006 годзе па спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура. Журналістыка» . Чытаў «вялікую працу» — «журналіста» Яўгена Валошына пра халадзільнік у інтэрнаце № 2. Яўген напісаў, як студэнт-першакурснік. Вельмі аднабока, абы штосьці смажанае ўхапіць.*

@

*Я ўвогуле не разумею, навошта нешта выкідваць. Як кажуць, у гаспадарцы прыдасца ўсё. Напрыклад, днямі шмат якія тэлевізійныя навіны расказалі пра ўкраінца, які з былых халадзільнікаў і мерсэдэсаўскага рухавіка зрабіў сапраўдны «лімузін».*

*А калі сур'ёзна, то можна толькі спачуваць тым людзям, якія ўсё выкідвалі. Гэта звычка старых (на жаль, яна передаецца і моладзі) часоў, калі ўсё забаранялася і ўсе «хадзілі строем».*

**Леанід.**

# «ШКОЛЬНЫЯ ХВАРОБЫ»...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ.)**

### Не грузіце!

Першакласнікам наогул ранцы не патрэбныя! Бо ім не павінны даваць хатнія заданні. Калі ж настаўніца дае пэўныя рэкамендацыі бацькам, дык мамы і таты павінны асцярожна займацца са сваімі дзецьмі. Галоўная памылка бацькоў: калі малое напісала неахайна, яны прымушаюць яго па шмат разоў перапісваць. У выніку сядзенне над хатнімі заданнямі займае шмат часу, і малыя пачынаюць баяцца вучобы. Трэба разумець, што дзіця ідзе ў школу ву-чыц-ца і гэта нармальна, калі адразу ў яго не атрымліваецца ўсё рабіць акуратна. Не трэба знясільваць малых і чытаннем. Гэта парушэнне, калі дзіця толькі пайшло ў школу, а яго ўжо ў першым класе пачынаюць правяраць і ацэньваць на хуткасць чытання. Глядзіце, каб дадатковыя заняткі з малым дома, інтэлектуальныя гурткі не прынеслі шкоды здароўю дзіцяці. Нават тое, колькі часу павінна забіраць у дзіцяці хатняе заданне, прапісана гігіенічнымі нормамі. Так, у другім класе гэта гадзіна, у 3-4-м —паўтары, 5-6-м — дзве, 7-8-м — не больш за 2,5 гадзіны, 9—11-м — 3. Прынамсі, паступовая школа будзе мяняцца, будуць уносіцца змяненні ў праграмы, змяняцца тэхналогіі навучання для таго, каб большая частка матэрыялу засвойвалася на занятках у школе, а хатняя падрыхтоўка займала менш часу.

І давайце не будзем лічыць усе падлеткавыя хваробы выключна школьным набыткам. А ці не перагружаюць самі бацькі сваіх малых дадатковай інфармацыяй, наймаючы для іх рэпетытараў і запісваючы ў дадатковыя гурткі? А ці сочаць за рэжымам дня дзіцяці? Можа, вы заганяеце яго за рабочы стол увечары, калі сцямнее, а пасля скардзіцеся на праблемы са зрокам у малога?

Калі ваш сын ці дачка займаецца ў першую змену, аптымальны час для хатніх заданняў пасля трох гадзін (малы ўжо паспее адпачыць пасля школы). У ідэале мэбля павінна расці разам з дзіцем. Але калі набыць стол-трансформер немагчыма і дзіця робіць хатнія заданні за звычайным пісьмовым, пастарайцеся хаця б, каб яго крэсла рэгулявалася, сядзенне магло падымацца ці апускацца ў залежнасці ад росту дзіцяці. У крэсла павінна быць спінка і падлакотнікі. Стол лепш паставіць ля акна. Заняткі выключна са штучным асвятленнем шкодныя. Лямпа павінна быць у дадатак да натуральнага асвятлення, пажадана, каб яна была невялікай магутнасці (у 35 ват). Святло павінна адбівацца ад рабочай паверхні, прамое ўздзеянне крыніцы святла на вочы недапушчальнае.

Сачыце за тым, каб дзіця дастаткова часу праводзіла на вуліцы, не менш за 2-2,5 гадзіны. Прычым гульні павінны быць актыўныя, рухавыя. Гэта добра, калі вашы дзеці носяцца, скачуць. Без гэтага немагчыма гарманічнае развіццё арганізма. Прычым проста спадзявацца на заняткі на ўроках фізкультуры ці ў спартыўнай секцыі мала. «Чым грашаць нашы школы? Калі малое на перапынку бегае па школе, яго спыняюць. Дзяцей увесь час абрываюць, і ў выніку ў старэйшых класах хлопцы і дзяўчаты наогул на перапынках не ўстаюць з-за парт. Часта школьныя рэкрэацыі застаўленыя — ці то кветкамі, ці там абсталяваныя нейкія куткі. Але нельга займаць плошчу, якая прадугледжана для актыўнага адпачынку дзіцяці, у нас спецыяльна ж і прыдуманы вялікія рухавыя перапынкі, каб дзеці маглі атрымаць разрадку», — кажа Ала Малахава. Дарэчы, спецыялісты заўважаюць: калі дзіця ўдосталь не набегаецца, то фізіялагічную патрэбу ў рухах яно будзе часткова «кампенсаваць» падчас урока — круціцца, «бегаць нагамі» пад партай.

### Есці пададзена

Прынамсі, многія з тых хвароб, што прыпісваюць у віну школе, з'яўляюцца ў дзяцей з-за недагляду бацькоў. Напрыклад, «харчовыя». У школе дзіця харчуецца толькі адзін раз. А дома? І якія прадукты трапляюцца яму на хатнім стале? У школах жа харчаванне ашчаджальнае, прычым як па складзе прадуктаў, так і па спосабах іх прыгатавання. Так, у школах дзеці не ядуць смажаных прадуктаў, асноўныя спосабы апрацоўкі — варэнне, тушэнне. Цяпер у школы актыўна закупляецца новае абсталяванне — печы, якія дазваляць гатаваць ежу на пары, максімальна захоўваючы каштоўныя рэчывы. У меню школьнікаў — толькі здаровыя прадукты, выключаныя вострыя інгрэдыенты (кетчуп, воцат, маянэз, востры перац), газаваныя напоі, чыпсы. Тут не гатуюць на касцявым булёне (выключэнне — курыны), мясныя прадукты бяруцца толькі вышэйшага і першага гатунку, свініна толькі мясная. А чым частуюць бацькі? Выкарыстанне прадуктаў хуткага прыгатаванне ў занятых бацькоў — не на карысць дзіцячаму арганізму. Тыя ж сасіскі ў школьным меню павінны быць не часцей за 2 разы на тыдзень. Недастаткова беларусы ўжываюць садавіны, гароднiны, сокаў, малака і кісламалочных прадуктаў. Да слова, па нарматывах, прадугледжаных для дзіцячых установ з кругласутачным знаходжаннем, на дзіця прыпадае каля 500 грамаў малочных прадуктаў на дзень. Тварог у меню дзіцяці павінен быць не радзей, чым двойчы на тыдзень, гэтак жа і рыба.

Ад сям'і залежыць, ці прывіта дзіцяці наогул культура харчавання, шмат якія дзеці, пакуль бацькі на працы, жывуць толькі на перакусах.

Гастрыт таксама можа быць хатнім здабыткам. Даказана, што гэта інфекцыйнае захворванне. І калі ў сям'і ёсць людзі з такой хваробай, дык пажадана, каб у дзіцяці быў уласны посуд, які будзе старанна апрацоўвацца.

### Думайце самі, рашайце самі

Безумоўна, сучасным школьнікам складаней вучыцца, чым іх папярэднікам, нагрузкі большыя. Цяпер у першым класе выкладаюцца адразу дзве мовы — руская і беларуская. Ужо да таго, як прыйсці ў школу, дзеці павінны ўмець лічыць — хаця б да дзесяці — і ведаць літары. А ў некаторых школах наогул прымаюць дзяцей, якія па ўзроўні сваёй падрыхтоўкі могуць выконваць такія камбінацыі з лічбамі, якія іх бацькі ў свой час атрымлівалі толькі ў другім класе. Адсюль узнікае пытанне, ці трэба загадзя рыхтаваць малых да школы, каб пасля на занятках яны менш напружваліся. Звяртаюся з ім да Алы Антонаўны. «Тут сітуацыя неадназначная. Усё павінна быць у разумных межах. Сёння быццам узнікла нейкая масавая істэрыя, многія бацькі плацяць за падрыхтоўку дзяцей да школы, і ёсць рызыка, што некаторыя з іх могуць трапіць туды, дзе заняткі з дашкольнікамі — гэта проста выбіванне грошай. Не думаю, што добра, калі з дашкольнікамі пачынаюць займацца напісаннем. Перавучыцца ў школе пасля будзе вельмі цяжка. З іншага боку, добра, калі ў школах ранняга развіцця з малымі займаюцца лепкай, аплікацыяй, малюнкам — развіваюць маторыку. Бесперапыннае пісанне ў школе малым даецца вельмі цяжка, кісць рукі стамляецца, калі трэба нешта выводзіць, не адрываючы руку ад аркуша. Неабходна займацца з дашкольнікамі, у якіх ёсць дэфекты мовы — хадзіць да лагапеда, інакш узнікнуць цяжкасці. І, натуральна, дзяцей трэба рыхтаваць да школы — умацоўваць здароўе. Некаторыя медыцынскія паказанні могуць быць падставай для адтэрміноўкі ад школы, напрыклад, цукровы дыябет. І калі медыкі, псіхолагі раяць вам не спяшацца аддаваць дзіця ў першы клас, трэба прыслухацца да іх парадаў».

Ды і ашчадней бацькам трэба ставіцца да сваіх малых. Само навучанне не шкодзіць здароўю дзіцяці. Але вось калі ў малога нешта не атрымліваецца ці яно не разумее матэрыял, гэта ўжо небяспечна. Асабліва калі яшчэ і бацькі насядаюць на дзіця, прычэпліваюць на яго ярлыкі «гультая» і «няўмекі». Ёсць дзеці марудлівыя ад прыроды, якім больш часу трэба для засваення матэрыялу. Не трэба іх увесь час падганяць і даводзіць да стрэсу. А лепш — дапамагаць, тлумачыць. І ўважліва сачыце за тым, з якім настроем дзіця ідзе ў школу, калі нешта не так, не лянуйцеся — пагаварыце з настаўнікам ці звярніцеся да школьнага псіхолага.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Тусоўка!

# З ІБІЦЫ Ў МІНСК! З МІНСКА — У ЛОНДАН!

### Упершыню ў Беларусі прайшоў клубны фестываль Milk'n'2 Sugars




Фота Таццяны ЗЯНЬКЕВІЧ.

Гасцей і танцораў прымаў начны клуб «Тытан» — хаўз-вечарынка з унікальнымі светлавымі эфектамі і 20-кілаватнай магутнай гукавой сістэмай. Менавіта беларускую сталіцу ў якасці першай падчас прэм'ернага візіту ў СНД выбраў вядомы брытанскі хаўз-праект Milk'n'2 Sugars.

— Нашы MN2S ночы пабывалі ва ўсіх чатырох кутках свету, што дае нам магчымасць дацягнуцца да тых, хто вельмі любіць клубную музыку і не змог трапіць на нашы вялікія вечарынкі ў Лондане, Маямі і Амстэрдаме, — распавядае адзін з уладальнікаў лэйбла Milk'n'2 Шэран Эрбакас. — Кожныя выхадныя дзе-небудзь у свеце мы праводзім вечарынку. Хаўз-вечарынкі MN2S першага класа ладзім на самых лепшых сусветных танцпляцоўках з найлепшымі дыджэямі і жывымі выступленнямі. Гэта наш першы прыезд у Беларусь, але мы вельмі радыя такой магчымасці і прыехалі з фантастычным шоу разам з Bodyrox, Robert Owens і Rae.

Milk'n'2 Sugars — брэнд, якому амаль 15 гадоў. Ён бярэ пачатак з шалёных вечарынак братоў Шэрана і Дэйва Эрбакасаў, якія разам з сябрам Цімам Бернетам ускалыхнулі спачатку начное жыццё Лондана, а затым і ўсяго свету. Сёння пад маркай Milk'n'2 Sugars аб'яднаныя каля 200 найбольш вядомых у сусветнай танцавальнай культуры выканаўцаў. Штогод MN2S праводзіць больш за 100 клубных мерапрыемстваў па ўсім свеце. Пад мелодыі найлепшых хаўз-дыджэяў Milk'n'2 Sugars «запальваюць» на Ібіцы, у Лондане, Маямі, Амстэрдаме. А цяпер і ў Мінску!

Беларускую сталіцу наведалі вядомыя зоркі еўрапейскай клубнай музыкі Роберт Оўэнс, дуэт Bodyrox і спявачка Rae. Голас першага крытыкі называюць адным з найлепшых галасоў хаўз-музыкі, а Rae — не толькі выдатнай вакалісткай, але і дыджэем. Дуэт Bodyrox вядомы аматарам па ўзнагародзе MTV Video Music Awards, якую дуэт атрымаў у 2007 годзе ў намінацыі «Найлепшае танцавальнае відэа». Трэкі гэтых артыстаў пастаянна займаюць топавыя пазіцыі вядучых музычных чартаў Еўропы.

— У Беларусі мы ўпершыню, — прызналіся выканаўцы. — Пра клубную культуру вашай краіны ведаем няшмат. Клубная культура за апошнія 10 гадоў вельмі істотна выйшла наперад у сваім развіцці. У Беларусі, спадзяёмся, таксама.

Мінскі тур Milk'n'2 Sugars быў рэалізаваны пры падтрымцы ААТ «Півавараная кампанія «Балтыка». Кампанія вядомая сваёй спонсарскай дапамогай самым лепшым клубным падзеям Беларусі (фестываль электрамузыкі «Космас наш!», канцэрты жывой музыкі «ВечеGreenка», канцэрты «Банд'эрос», «Уматурман», «Каста» і інш.)

Брытанскія ж госці пабылі ў Мінску толькі адну ноч. Пасля заканчэння вечарынкі — а восьмай зранку — яны ўжо трымалі курс на Лондан.

**Ілья ЛАПАТО.**

**ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО» (организатор аукциона) 29 декабря 2009 года в 11.30 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже объекта, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи объекта, равной одной базовой величине, и права заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания, которые составляют единый предмет аукциона.**

**На аукционные торги выставляется:** не завершенное строительством капитальное строение – здание физкультурно-оздоровительного комплекса и право заключения договора аренды земельного участка. Здание трехэтажное, общей площадью 5113,41 кв.м, стены кирпичные, готовность строения 25 % (строительство велось в период с 1989 по 1991 гг.). Объект расположен по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Нормандия-Неман, 167, на земельном участке площадью 0,5109 га. Срок аренды земельного участка – 25 лет.

**Условия аукциона:** Осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте не менее 3-х лет; создание покупателем не менее 3-х рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

**Начальная цена предмета аукциона** – 22 921 627 рублей (в том числе: объект – одна базовая величина, установленная на дату проведения аукциона, право аренды земельного участка – 22 886 627).

**Задаток для участия в аукционе** в размере 2 200 000 рублей перечисляется в срок по **24 декабря 2009 года** включительно на расчетный счет **№ 3642900000841** в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество».

**Продавец:** Государственное учреждение образования «Институт повышения квалификации и переподготовки кадров Министерства по чрезвычайным ситуациям Республики Беларусь» (Минская область, Борисовский район, пос. Светлая Роща, тел. (8 0177) 74 84 51, 76 08 21).

**Арендодатель земельного участка:** Борисовский районный исполнительный комитет (Минская область, г. Борисов, ул. Чапаева, 6).

**Подробное извещение** о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 17 марта 2009 г. № 49.

В случае изменения на дату проведения аукциона размера базовой величины начальная цена предмета аукциона корректируется с учетом изменения размера базовой величины.

Фотографии продаваемых объектов, а также информация об объявленном аукционе и предметах аукциона дополнительно размещаются на сайте Минского облисполкома: **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество» в разделах «Власть», «Управления и комитеты облисполкома».

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:** Подписать протокол о результатах аукциона. В течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка победитель аукциона (претендент на покупку) обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (рассрочка не предоставляется), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, в установленном порядке заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка. Представить копии платежных документов организатору аукциона в течение одного рабочего дня со дня оплаты.

Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому объекту, выставляемому на аукцион. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 320, тел. 224 39 76, 500 47 10.** Последний день подачи заявлений **24 декабря 2009 г. до 13.00.**

Акцыі

## Кінастужкай па СНІДзе

**Нацыянальная кінаакцыя, прысвечаная барацьбе са СНІДам, сабрала тысячы пераважна маладых гледачоў. У 17 гарадах Беларусі пры актыўнай падтрымцы органаў мясцовай улады прайшоў паказ тэматычных відэаролікаў і мастацкага фільма «Вірус».**

Кінастужка (у галоўных ролях Рычард Гір і Філ Колінз), знятая па вядомай дакументальнай кнізе амерыканскага журналіста Рэндзі Шылтса «Аркестр працягваў іграць», была абраная не выпадкова. Кожны дзень становяцца вядомымі новыя звесткі аб маштабах эпідэміі, якая ахапіла свет у канцы 80-х. Калі на барацьбу са СНІДам выдаткоўваюцца велізарныя сродкі і аб хваробе кажуць адкрыта, фільм дапамагае ўсвядоміць, наколькі важна захаваць волю да жыцця, аб'яднацца ў барацьбе з распаўсюджваннем эпідэміі, падтрымаць людзей, якія хварэюць на СНІД.

Акцыя адбылася як у Мінску, абласных цэнтрах Брэсце, Віцебску, Гомелі, Магілёве, так і ў Жлобіне, Калінкавічах, Мазыры, Светлагорску, Бабруйску, Лідзе, Салігорску, Пінску, Рэчыцы, Рагачове і іншых невялікіх і малых населеных пунктах.

Усе кінасеансы прайшлі пры запоўненых залах і суправаджаліся розыгрышам прызоў: футболак, кепак і заплечнікаў. Іх атрымалі гледачы, якія далі лепшыя абяцанні ў барацьбе са СНІДам.

Нагадаем, што Сусветная кампанія «Спыніць СНІД. Выканаць абяцанне», якая пачалася 1 снежня 2005 года, прапаноўвае рэальную праграму дзеянняў: здаць тэст на ВІЧ, падарыць цеплыню і разуменне ВІЧ-інфіцыраваным людзям, не ўжываць наркотыкі, займацца спортам, захоўваць вернасць блізкаму чалавеку. Дэвіз акцыі: «Цяжка выратаваць увесь свет, але можна пачаць з сябе і з тых, каго вы кахаеце!».

Па звестках афіцыйнай статыстыкі, у Беларусі на 1 лістапада гэтага года зарэгістравана 10 529 выпадкаў ВІЧ-інфекцыі. Большасць ВІЧ-інфіцыраваных — маладыя людзі ва ўзросце ад 15 да 29 гадоў.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## БЕЛАРУСКАЯ АДУКАЦЫЯ НА АНГЛІЙСКАЙ МОВЕ

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі група замежных грамадзян упершыню будзе атрымліваць вышэйшую адукацыю на англійскай мове. Маладыя людзі з Лівана, Пакістана, Сірыі і Нігерыі будуць навучацца на факультэце тэлекамунікацый.**

Ідэя аб адкрыцці навучання ў БДУІР на англійскай мове нарадзілася яшчэ ў 2003 годзе пасля рабочай паездкі рэктара ўніверсітэта Міхаіла Батуры ў Сірыю і Ліван. Там прадстаўнікамі ліванскай асацыяцыі выпускнікоў савецкіх ВНУ была дадзена вельмі высокая ацэнка якасці беларускай вышэйшай адукацыі. Усе яны, з іх слоў, былі запатрабаваныя і мелі высокі рэйтынг у работадаўцаў. Аднак толькі праз 6 гадоў ідэя ўвасобілася ў рэальнасць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Вакол свету

# ГЛЫТОК ІНДЫЙСКАГА ПАВЕТРА

**Звычайна, наведваючы іншую краіну, чалавек імкнецца не толькі прывезці з яе сувеніры і падарункі, але і пакінуць у сваёй душы часцінку таго месца, дзе пабываў, захаваць у памяці малюнак, які стане неад'емным складнікам яго жыццёвага слайд-шоу, якое хочацца пераглядаць зноў і зноў. І я таксама не выключэнне, таму ўсіх, каму цікава пакатацца на індыйскім слане, пакаштаваць індыйскай гарбаты і пабачыць сёмы цуд свету, запрашаю ў падарожжа!**

### Рэальная казка або казачная рэальнасць

Яшчэ да таго моманту, як я ступіла на індыйскую зямлю, мяне не пакідала адчуванне таго, што я адпраўляюся ў казку. Гэта невыпадкова і напрамую звязана з дзіцячымі ўспамінамі. Я добра памятаю, як яшчэ маленькай дзяўчынкай, з цікаўнасцю глядзела індыйскія стужкі. Прыгожыя людзі ў прыгожым адзенні, якія заўсёды спяваюць і танцуюць, і, вядома ж, безварыянтная перамога дабра над злом. Ну, ці не казка? Прайшло гадоў пятнаццаць, і ў мяне з'явілася магчымасць паглядзець гэту казку ўжо не на тэлеэкране, а ў рэальным жыцці. І хачу сказаць, што дзіцячы стэрэатып амаль не парушыўся. Індыя — дзівосная краіна, у якой жывуць вельмі прыемныя людзі, прыгожыя як знешне, так і ўнутрана. Што датычыцца песень і скокаў, то яны насамрэч займаюць важнае месца, здаецца, што індыйцы ўжо нараджаюцца танцорамі і спевакамі. Аб гэтым з энтузіязмам расказаў мой індыйскі сябра (цяпер я магу смела яго так назваць) з горада Нью-Дэлі. Я ў сваю чаргу распавяла субяседніку аб беларускіх традыцыях і звычках. Цікавая і пазнавальная атрымалася размова. Выявілася, што беларус і індыец вельмі лёгка могуць знайсці агульную мову.

Але ж вернемся да Нью-Дэлі, сталіцы Індыі, куды непасрэдна мне і пашанцавала трапіць. Кажучы пра гэты горад, не магу не прыгадаць адну народную мудрасць — не месца ўпрыгожвае чалавека, а чалавек месца. Што датычыцца індыйскай сталіцы, то яе ўпрыгажэннем з'яўляецца трынаццацімільённае насельніцтва. Падумаць толькі, у адным горадзе больш жыхароў, чым ва ўсёй нашай Беларусі. Але ж тут трэба ўлічваць і памеры паўвострава Індастан. Аднак, не так уразіла мяне колькасць насельніцтва, як лад жыцця яго большасці. Для мяне ўбачыць тое, як людзі мірна жывуць у прамым сэнсе пад нябесным купалам, было ўпершыню. Прычым, гледзячы ім у вочы, разумееш, што для іх гэта не проста нармальна — інакш нават быць не можа і не трэба. Ствараецца ўражанне, што Індыя — гэта адна велізарная хата, пад дахам якой пражывае адна велізарная сям'я.

### Індыйская жамчужына Тадж Махал

Каханне творыць цуды... Гэта не проста прыгожае выказванне, і ўзгадала я яго не проста так, дзеля трапнага слоўца. Проста менавіта ў Індыі я пераканалася ў праўдзівасці гэтых слоў. І няхай кіне ў мяне камень той, хто, зірнуўшы на Тадж Махал, будзе здольны гэта адмаўляць. Бо менавіта гэта светлае і непаўторнае пачуццё Шаха Джахана да жонкі Мумтаз Махал падаравала нам у 1653 годзе сёмы цуд свету. Ёсць шмат легендаў на гэты конт, шмат інтэрпрэтацый чароўнай гісторыі кахання. Што ў іх праўда, а што — выдумка, кожны вырашае для сябе сам. Несумненна толькі адно: гэты твор мастацтва — увасабленне высокага пачуцця. Гісторыя ўзнікнення Тадж Махала асабіста мяне кранае да глыбіні душы. Джахан страціў самую дарагую жанчыну ў сваім жыцці, яна не перанесла нараджэння іх чатырнаццатага дзіцяці, але каханне назаўжды засталося ў сэрцы шаха. Ён вырашыў узвесці ў горадзе Агра такі храм, прыгажосць якога змагла б параўнацца хіба з прыгажосцю каханай. І праз 22 гады, з дапамогай рук больш чым дваццаці тысяч чалавек свет пабачыў цуд надзвычайнага хараства — сімвал вечнага кахання. Цела любай жонкі шаха было перавезена ў беламармуровы, з каштоўнымі камянямі, Тадж Махал. Для сябе ж Джахан вырашыў пабудаваць маўзалей з чорнага мармуру — дакладную копію першага. Але, на вялікі жаль, яму гэта не ўдалося. Пасля звяржэння яго ўласным сынам Аўрангзебам будаўніцтва было прыпынена. Няшчасны бацька быў пасаджаны ў вежу чырвонага Форта ў Агры. Апошнія дзевяць гадоў свайго жыцця ён правёў у пакоі, з акна якога быў бачны Тадж Махал. І толькі пасля смерці Джахан з'яднаўся са сваёй каханай назаўсёды. Па завяшчанні яго пахавалі ў тым жа склепе.



Прайшло не адно тысячагоддзе, а людзі з розных куткоў планеты прыязджаюць у Агру, каб на свае вочы ўбачыць храм надзвычайнай прыгажосці і адчуць подых кахання. Мне таксама пашчасціла апынуцца сярод іх. Не хопіць слоў, каб апісаць тыя пачуцці, якія перапаўнялі мяне ўсю ў той момант, калі я стаяла перад гэтым шэдэўрам. Можна шмат расказваць пра індыйскі цуд, але лепш адзін раз убачыць. Хочацца толькі сказаць, што, пабываць у Індыі і не наведаць Тадж Махал — гэта значыць абнуліць ваша падарожжа.

### Імпрэза ручнога рамяства

Адной з самых важных падзей у Індыі ў перыяд майго там знаходжання стала 28-я выстава індыйскіх вырабаў ручнога рамяства ў Нью-Дэлі. Гэта найбуйнейшая ў Азіі спецыялізаваная выстава-кірмаш. Арганізатарамі гэтага мерапрыемства з'яўляюцца Савет па прасоўванні экспарту ручных вырабаў Індыі і Міністэрства тэкстылю ўрада Індыі. Галоўная мэта індыйскіх рамеснікаў, акрамя дэманстрацыі свайго ўмельства, — гэта пошук замежных партнёраў дзеля наладжвання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, якое ў сваю чаргу будзе садзейнічаць павелічэнню прысутнасці індыйскіх ручных вырабаў на сусветным рынку. У перыяд з 10 па 13 кастрычніка дзверы велізарнага Экспацэнтра ў Нойдзе былі адчыненыя для ўсіх, хто меў жаданне трапіць у свет эксклюзіўных індыйскіх вырабаў ручной працы з усіх рэгіёнаў краіны. Разнастайнасць экспанатаў насамрэч уражвала. У тым, што кожны «купец» змог знайсці свой «тавар» сумнявацца не выпадала. Направа пойдзеш — прадметы для любога інтэр'еру знойдзеш, налева пойдзеш — у царства адзення і ўпрыгажэнняў трапіш. Проста рушыш — сувеніры і падарункі на любы густ і колер. І самае галоўнае, што ўсё — ад вышытага дывана да фігуркі слана — ручная работа, прычым найвышэйшага ўзроўню. Больш за 6000 замежных гасцей з розных краін свету прыехалі на гэтае свята ручнога рамяства. Нехта з мэтай набыцця выдатных тавараў і наладжвання перспектыўнага бізнэс-супрацоўніцтва, нехта — каб проста пацешыць вока і атрымаць асалоду ад вытанчанага відовішча.

### Замест пасляслоўя

Я пабыла ў Індыі ўсяго чатыры дні, але за гэты кароткі час паспела дакрануцца да культурна-гістарычнай прыгажосці, адчуць сябе на імгненне індыянкай, прымераўшы нацыянальнае адзенне — саары, пакаштаваць стравы індыйскай кухні і нават падвучыць мясцовую мову — хіндзі. А самае галоўнае — у мяне з'явіліся новыя сябры. Я сустрэла такую колькасць новых людзей, атрымала мноства станоўчых эмоцый, паклала яшчэ адзін бясцэнны досвед у жыццёвую скарбонку. Індыйскае падарожжа зноў пераканала мяне ў тым, што, дзе б ты ні знаходзіўся, у Індыі ці якой-небудзь іншай краіне, для таго, каб наладзіць кантакт з людзьмі, неабходна толькі мець адкрыты позірк і шчырую ўсмешку на твары — і ты абавязкова атрымаеш тое ж самае ў адказ. Хочацца дадаць яшчэ, што самае галоўнае і каштоўнае ўпрыгажэнне і Беларусі, і Індыі, і ўвогуле любой краіны — гэта людзі. І, знаходзячыся за межамі свайго роднага кутка, вельмі важна, на мой погляд, пакінуць добрае ўражанне не толькі пра сябе, але і пра сваю краіну. Спадзяюся, што ў мяне гэта атрымалася.

**Кацярына ДАРАФЕЙЧЫК.**

Муз-news

Вольга ПЛОТНІКАВА:

## МЯНЯЮ ПРАВЫ НА АЎТОГРАФ

**НЯГЛЕДЗЯЧЫ на атрыманае тры гады таму вадзіцельскае пасведчанне, спявачку і тэлевядучую Вольгу Плотнікаву ў сямейным аўто больш задавальняла роля пасажыра. Тым больш, што роля вадзіцеля трывала замацавалася за яе мужам і прадзюсарам Генадзем Маркевічам. Але нядаўна давялося і Вользе згуляць у «бландзінку на дарозе», выклікаўшы прыгоды на сваю галаву.**

«Мне трэба было паспець на канцэрт, а ў Гены была тэрміновая работа ў студыі, — тлумачыць спявачка. — Як дзяўчына смелая, я вырашыла, што спраўлюся сама, і замест таго, каб выклікаць таксі, узяла ў мужа ключы. Але толькі-толькі асвоілася на дарозе і дабавіла газу, як супрацоўнікі ДАІ не прымусілі сябе чакаць. І хоць перавышэнне хуткасці было зусім невялікае, я вельмі спужалася».

Як высветлілася, супрацоўнік Дзяржаўтаінспекцыі адразу прыкмеціў за рулём вядучую праграмы «Вялікі сняданак», таму і вырашыў прыстрашыць нядбайную «зорку». Але парушэнне на першы раз прабачыў, абмежаваўшыся прафілактычнай гутаркай... і дыскам з аўтографам.



**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Лепшыя з нас!**

# НЯХАЙ ЧАСЦЕЙ ГУЧЫЦЬ ГІМН НАШАЙ БЕЛАРУСІ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Кіраўнік Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрый ЛУКАШЭНКА разам з паралімпійкай Алесяй МАКРЫЦКАЙ.

Акрабатыка і біятлон, цяжкая атлетыка і таэквандо, бокс, веславанне, самба — у гэтых і іншых відах спаборніцтваў беларускія маладыя перспектыўныя спартсмены і трэнеры краіны падняліся на вышэйшыя прыступкі. Менавіта гэтыя дзяўчаты і хлопцы (усяго 141 чалавек) у 2010 годзе будуць атрымліваць стыпендыю Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Гэты адзін з самых значных праектаў клуб рэалізоўвае на працягу чатырох гадоў. За гэты час стыпендыятамі сталі больш за 300 чалавек.

Толькі за апошні год на рахунку стыпендыятаў клуба — 186 медалёў, у тым ліку 53 залатыя, 64 сярэбраныя і 69 бронзавых узнагарод.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Дзве сястры — Дар'я і Вольга ФЕДАРОВІЧЫ — лепшыя з лепшых у шашках.

## БЕЛАРУСКІЯ ВУЧОНЫЯ АТРЫМАЛІ ЎЗНАГАРОДЫ РАСКОСМАСУ

**Група беларускіх вучоных узнагароджана памятнымі знакамі Федэральнага касмічнага агенцтва Расіі (Раскосмасу) «За заслугі ў арганізацыі касмічнай дзейнасці». Цырымонія ўзнагароджання прайшла ўчора ў Мінску.**

Узнагароды атрымалі першы намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Пётр Віцязь, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Сяргей Абламейка, галоўны вучоны сакратар НАН Беларусі Сяргей Чыжык, генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі Аляксандр Тузікаў, намеснік дырэктара Інстытута цепла- і масаабмену імя А.В. Лыкава НАН Беларусі, першы намеснік навуковага кіраўніка саюзнай праграмы «Нанатэхналогія-СД» Кірыл Дабрэга, намеснік начальніка ўпраўлення вытворчай і інавацыйнай дзейнасці НАН Беларусі Аляксандр Паноў, галоўны спецыяліст аддзялення фізікі, матэматыкі і інфарматыкі НАН Беларусі Сяргей Пісарэўскі.

**БЕЛТА.**

**Да ведама**

## НЯПОЎНАГАДОВЫМ ЗАБАРОНЯЦЬ У МІНСКУ З'ЯЎЛЯЦЦА НА ВУЛІЦЫ ПАСЛЯ 23.00 БЕЗ БАЦЬКОЎ

**ДЭПУТАТЫ Мінгарсавета ўчора на 17-й сесіі ўзгаднілі забарону знаходжання няпоўнагадовых да 16 гадоў на вуліцах сталіцы і ў іншых грамадскіх месцах з 23.00 да 6.00 без суправаджэння бацькоў.**

У выпадку парушэння гэтай нормы супрацоўнікі міліцыі ўпаўнаважаны складаць акты. Далей іх будуць разглядаць камісіі па справах няпоўнагадовых адміністрацый раёнаў Мінска і прымаць меры грамадскага ўздзеяння ў межах сваіх паўнамоцтваў.

Начальнік ГУУС Мінгарвыканкама Леанід Фармагей, спасылаючыся на аналіз штосутачных зводак аператыўнай абстаноўкі ў Мінску, паведаміў, што 40 працэнтаў усіх злачынстваў, якія ўчыняюцца няпоўнагадовымі і з іх удзелам, адбываецца ва ўзросце 16—17 гадоў у грамадскіх месцах у перыяд з 22.00 да 6.00 гадзін. Разам з тым на сёння знаходжанне няпоўнагадовых у грамадскіх месцах сталіцы ў начны час не абмежавана.

Прыняцце гэтага пытання выклікала ў час сесіі гарсавета ажыўленыя дэбаты, тон якім задало выступленне дэпутатаў Маладзёжнай палаты (яна дзейнічае пры Мінгарсавеце ўжо другі год). Моладзь прапанавала знізіць узроставы цэнз з 18 гадоў, як планавалася першапачаткова, да 16 гадоў. Самі ж дэпутаты, выступаючы з думкамі і прапановамі, прызнавалі, што даўно сесія не прымала такіх важных рашэнняў. Адзначалася, што да гэтага пытання Мінгарвыканкам і Мінгарсавет падыходзілі ўшчыльную некалькі разоў, і цяпер настаў час прыняць канчатковае рашэнне.

Між тым канчатковую кропку паставіць Міністэрства юстыцыі, якое правядзе экспертызу праекта рашэння сесіі Мінгарсавета.

**БЕЛТА.**

**У суседзяў**

## Палякі супраць экалагічнага забойства эканомікі

**У найбліжэйшыя 20 гадоў Польшча павінна ўкласці ў абмежаванне выкідаў парніковых газаў 92 млрд еўра. Як паведамляюць польскія СМІ, гэтая лічба ўтрымліваецца ў дакладзе сусветна вядомай кансалтынгавай кампаніі McKinsey.**

Дакумент гэты павінен стаць падставай для нацыянальнай стратэгіі па скарачэнні эмісіі газу $CO_2$. Аднак эксперты McKinsey ў сваім аналізе не далі ацэнкі наконт таго, ці здольная Польшча выдаткаваць такія каласальныя грошы на барацьбу з выкідамі парніковых газаў і якім чынам такія астранамічныя ўкладанні адаб'юцца на эканоміцы краіны. І сапраўды, для чаго патрэбныя такія вялізныя выдаткі? Эксперты ААН сцвярджаюць, што калі нічога не рабіць, то ў 2050 годзе эмісія цеплавых газаў у свеце падвоіцца. Таму ААН хоча, каб гэтая эмісія, наадварот, на 90 % знізілася. Для Польшчы выкананне такой задачы з'яўляецца асабліва цяжкім, таму што яна, як адзначае газета «Жэчпаспаліта», адносіцца да самых «брудных» краін у Еўрасаюзе: у яе энергетычным балансе вельмі вялікая доля належыць вугалю. І для таго, каб паменшыць эмісію $CO_2$ на 30 %, спатрэбяцца тыя самыя 92 млрд еўра.

— У нас няма выйсця: мы вымушаныя панесці выдаткі на скарачэнне эмісіі. Або мы пойдзем гэтым шляхам, або выйдзем з ЕС, — лічыць прафесар Кшыштаф Жміеўскі, кіраўнік Грамадскай кансультатыўнай рады Нацыянальнай праграмы скарачэння эмісіі.

Па ацэнцы экспертаў McKinsey, калі польскі ўрад нічога не распачне ў плане рэдукцыі выкідаў газаў, а эканоміка будзе развівацца такімі ж тэмпамі, то праз 20 гадоў эмісія $CO_2$ у Польшчы ўзрасце на 30 працэнтаў. Вось чаму краіна павінна накіроўваць штогод на абарону клімату ў сярэднім 0,9 працэнта ВУП (для параўнання — на ваенную абарону штогод накіроўваецца 1,95 % ВУП). Па меркаванні экспертаў, ужо з 2011 года Польшча павінна будзе расходаваць на рэдукцыю выкідаў цяплічных газаў 2,5 млрд еўра ў год, а з 2020 года — у два разы больш.

Даклад McKinsey не прадугледжвае шэраг змен у стылі жыцця палякаў, напрыклад, скарачэнне аўтамабільнага руху або паніжэнне тэмпературы ў дамах, да чаго заклікаюць, у прыватнасці, скандынаўскія дзяржавы. Укараненне нізкаэмісійнай стратэгіі адаб'ецца на рахунках за цяпло, энергію і камунальныя паслугі.

Як вядома, Еўрасаюз абавязаўся да 2020 года скараціць эмісію на 20 %, аднак гатовы падняць гэты паказчык да 30 %, калі дзяржавы за межамі ЕС (напрыклад, Кітай або ЗША) возьмуць на сябе падобныя абавязацельствы.

Якія ж, паводле меркавання экспертаў McKinsey, найлепшыя метады рэдукцыі эмісіі $CO_2$ у Польшчы ? McKinsey прапаноўвае для гэтага 125 спосабаў: ад ужывання біяпаліва, новых нормаў будаўніцтва дамоў да адпаведнага ўгнаення лугоў і ўсталявання эфектыўных сістэм кліматычнага кантролю. Аднак найбольшыя змены павінны былі б закрануць сектар, які адказвае ў Польшчы за 60 % эмісіі — энергетыку, будаўніцтва і транспарт.

Выдаткі на барацьбу з парніковымі газамі не выклікаюць энтузіязму ў польскага ўрада.

— Абарона клімату мае сэнс, калі засноўваецца на глабальнай салідарнасці. Калі мы заб'ём сваю эканоміку, а іншыя будуць пастаянна эмітаваць такую вялікую колькасць двухвокісу вугляроду, як дагэтуль, то гэта не будзе мець сэнсу, — гаварыў прэм'ер-міністр Дональд Туск на з'ездзе Еўрапейскай народнай партыі, які адбыўся ў Боне.

**Міхаіл БАЦЯН.**

# ЁСЦЬ ТАКОЕ КІНО! А ЯКОЕ ЯНО?

**Ёсць беларускае кіно!.. Ужо 85 гадоў, як ёсць. Сёння ў яго Дзень нараджэння. І гэта сапраўды свята для ўсіх, бо яно так і засталося самым важным з мастацтваў — таму што здольнае прыцягнуць вялікую аўдыторыю.**

**І мы хочам верыць: жыве беларускае кіно. Чакаем — так, каб здзівіцца, уразіцца і потым доўга абмяркоўваць, як звычайна гатовыя гаварыць пра падзеі з уласнага жыцця. Можа наша, глядацкая, праблема якраз у тым, што мы хочам глядзець кіно, думаючы, што яно абавязкова павінна быць пра нас? Ну, так, як раней... А свет жа вельмі змяніўся, і гэта імгненна адлюстравалася на экране. Сусветным. Бо ўзніклі тэмы, формы і жанры, якія агульныя для людзей ва ўсім свеце — універсальныя. Аднак пры гэтым кожная краіна трымаецца за тое, каб захаваць сваю адметнасць у кіно. Можа, таму апошнім часам так шмат разважанняў пра сённяшні твар беларускага кіно. Паспрабуем разабрацца: у чым ён і што яму найбольш пасуе?**

**ШУКАЦЬ адказ мне дапамаглі спецыялісты, якія ведаюць гісторыю беларускага кіно і сочаць за ўсімі працэсамі, якія адбываюцца ў ім сёння. І вельмі за яго хварэюць душой — таму што любяць. Пра адметнасць беларускага светапогляду і яго праявы на экране мы размаўлялі з Антанінай Карпілавай, загадчыцай аддзела экранных мастацтваў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

### БЕЛАРУСКІ СТЫЛЬ

— Выдатны наш майстар сказаў: няма стылю, які адрозніваў бы беларускі кінематограф, — успамінае Антаніна Аляксееўна. — Гэта сказаў чалавек з веданнем справы, праўда, гадоў 25 назад. Магчыма, з цягам часу ён пераасэнсаваў гэтыя словы, таму што цяпер мы самога Валерыя Рубінчыка ўспрымаем як класіка.

Але калі казаць не пра мінулыя дасягненні, а пра сённяшні дзень, то беларускі стыль я бачу ў неігравым кіно і ў анімацыйным. Ёсць у беларускім кіно кірункі, у якіх захоўваецца нешта запаветнае, этнічнае. Дакументальнае кіно — перліна нашага кінематографа. У ім адбываецца даследаванне этнічнага архетыпа, вобраза беларуса. Гэта фільмы Віктара Аслюка і Галіны Адамовіч. Да гэтага ж напрамку прымыкаюць фільмы Міхаіла Ждануўскага, але яго больш цікавіць духоўная сфера. Неігравое кіно — лідар у захаванні нацыянальных рысаў у кінематографе. Менавіта кінематограф «малых формаў» супрацьстаіць глабалізацыйным працэсам. Яшчэ ёсць навукова-папулярнае кіно, у ім бы я вылучыла напрамак экалагічнага кіно. Наш гонар — фільмы кандыдата біялагічных навук Ігара Бышнёва, у якіх ідзе даследаванне беларускай прыроды, яны пазначаныя пячаткай этнічнай непаўторнасці краіны, што важна для прыцягнення турыстаў.

Захоўвае этнічную непаўторнасць і наша анімацыйнае кіно. Маю на ўвазе перш за ўсё фільмы-казкі. Гэта фільмы пра Несцерку, серыял, які адноўлены праз 20 гадоў Ігарам Волчакам пасля Яўгена Ларчанкі. І, вядома ж, фільмы Міхаіла Тумелі: тое, што ён робіць з выцінанкай у фільмах «Беларускія прымаўкі», — па сутнасці захаваная народная творчасць. Унікальны праект «Аповесць мінулых гадоў», які прысвечаны гербам Беларусі, з гісторыяй гарадоў. Дзіўна, што гэтыя фільмы не знаходзяць водгук у адпаведных арганізацый: іх трэба было пускаць і ў метро, паказваць на маніторах.

У малых формах заключана вялікая магчымасць для захавання нацыянальных адметнасцяў. Бо ў вялікім кіно ідзе крэн у бок пэўнага касмапалітызму. Мы бяром не самыя лепшыя ўзоры і клануем іх у сваім кіно. А каго гэтым можна здзівіць?

### ВЯЛІКАЕ КІНО

— Што датычыцца масавых жанраў, то ў нас традыцыйна найбольш развітая была меладрама. Хоць яна была схаваная пад назвамі «аповесць», псіхалагічная драма. З баевікамі ці прыгодніцкімі фільмамі таксама было ўсё ў парадку — яны хаваліся пад ваеннымі стужкамі.

Патэнцыял у нас быў вялікі. Таму што, акрамя масавых жанраў, было цудоўнае аўтарскае кіно. Тут тры прозвішчы — Тураў, Рыбараў, Рубінчык. «Дзікае паляванне караля Стаха» перамагала на конкурсах таямнічых, містычных фільмаў — цікавы гатычны раман, дзеянне якога адбываецца ў замку.

Безумоўна, каб здымаць такое кіно, патрэбны не проста рэжысёр, а асоба. Рэжысура — наша балючая кропка. Старэйшае пакаленне пайшло з жыцця, а тыя, хто ёсць, не працуюць на студыі. У Рабарава было некалькі праектаў, але яны не ажыццявіліся. І цяпер ён, на жаль, увогуле сышоў са студыі... У рэжысуру прыйшлі аператары і акцёры, а гэта трошкі іншыя прафесіі.

Вялікія надзеі былі на выпускнікоў акадэміі мастацтваў. Была майстэрня Турава і майстэрня Пташука (завяршыў яго курс Вячаслаў Нікіфараў). Прыход маладой рэжысуры не ўзбагаціў беларускае кіно.

Віталь Дудзін і Аляксандр Яфрэмаў — цяпер у абойме самых пладавітых нашых рэжысёраў. Мы бачым добрае рамяство, веданне прафесіі, але мастацкіх адкрыццяў няма. Аднак моладзь, у адрозненне ад іх на жаль, нават рамяства не засвоіла. Дзе веданне мантажу, падбору акцёраў? Няма жадання шукаць ва ўсіх сэнсах. І быццам бы розныя пакаленні цяпер працуюць, а праблемы адны і тыя ж. Калі хто валодае рамяством, то не хапае мастацкага густу, альбо імкнення да ўзбагачэння кінамовы. У кіно ўсё залежыць ад маштабу асобы. Расійскі рэжысёр Аляксандр Сакураў нават у складаныя часы здолеў шукаць свой погляд, увайшоў у гісторыю кінамастацтва. Для гэтага можна зняць і адну карціну, але якую...

### КОЛЬКАСЦЬ І ЯКАСЦЬ

— Якасць — паняцце адноснае, і ўсе разумеюць яго па-рознаму. Напэўна, з пункту гледжання дырэктара кінастудыі, галоўны паказчык якасці — рэйтынгі фільмаў, наведванне. Але тут і без сацыялагічных даследаванняў зразумела, што гэты паказчык не спрацоўвае. Наступны паказчык — з'яўленне элітарных фільмаў (гэта могуць быць адзінкавыя ўзоры), якія прадстаўляюць краіну на фестывалях. І ёсць так званы мэйнстрым — кіно для сярэдняга гледача. Калі ўвесці крытэрыі якасці, то яны будуць розныя для розных фільмаў.

Зразумелае імкненне нашай кінастудыі працаваць на сярэдзіну. Але пытанне ўпіраецца ў грошы. Таму што калі для фестывальнага кіно дастаткова малога бюджэту, то для масавага і сярэдняга гледача павінны быць «прынады»: яркі відовішчны рад і медыйныя твары акцёраў.

У нас на кіно выдаткоўваюцца грошы, але невялікія (у параўнанні з бюджэтамі сярэдніх галівудскіх карцін), і іх падзяляюць на вялікую колькасць праектаў з акцэнтам на тэлевізійныя. Да тэлефільмаў некалі было стаўленне як да сур'ёзнага кіно, і беларускае тэлекіно было магутным. Але цяпер яно ўспрымаецца як другаснае: з-за серыялаў, якія прымушаюць слізгаць па паверхні тэлеэкрана поглядам. У той час, калі вялікі экран дае асобнае ўспрыманне, нават зярністасць плёнкі ўплывае на гледача, акрамя таго, прагляд у кіназале стварае атмасферу фіктыўнай адзіноты. Таму вялікае кіно ніяк не павінна сысці з нашай кінастудыі.

### «КІНАБРЭНДЫ»

— Часта гучыць пытанне: ці патрэбна цяперашняму пакаленню такая колькасць фільмаў ваеннай тэматыкі? Ёсць супрацьлеглыя пункты погляду. Першы: гэтая тэма ўжо адпрацаваная ў беларускім кіно і надакучыла масаваму гледачу. А з іншага боку, ёсць такое паняцце як «брэнд». «Брэндавай» стала ваенная тэма для нашай студыі. Баевікі — жанр, які найбольш стасуецца з ваеннай тэмай. Надта дарагія і відовішчныя баевікі мы не будзем рабіць, а на ўзроўні «Снайпера» — можна прыцягнуць гледачоў. Дынаміка ў ім добрая, але спецэфектамі такімі ўжо нікога здзівіць немагчыма. Затое ёсць акцёр, які трымае фільм.

> **Сцэнарый фільма пра Ефрасінню Полацкую — адна з шасці прапаноў на «нацыянальны» праект у 2010 годзе.**
>
> *Паводле слоў Першага намесніка Міністра культуры Уладзіміра Рылаткі.*

Наш пралік, на мой погляд, у тым, што вельмі традыцыйна вырашаюцца «брэндавыя» тэмы. Ваенная тэма падаецца вельмі акадэмічна, няма новых паваротаў. Зразумела, нейкія моманты ў вайне цяжка кранаць, напэўна, час яшчэ не прыйшоў. Але можна ашчадна ставіцца да памяці і пры гэтым даваць глебу для асэнсавання новым пакаленням.

Адзін з прыкладаў паспяховай распрацоўкі ваеннай тэмы — расійскі фільм «Мы з будучыні». Сутнасць у тым, што гэты сцэнарый быў у нас на студыі, на яго не звярнулі ўвагу. А атрымаўся фільм, які цікавы моладзі. Мы былі ўражаныя, калі з'явіўся расійскі фільм «Свае» — абсалютна наша тэма, пагранічны стан чалавека, які і наш, і не наш. Таму што Беларусь гістарычна была на скрыжаванні — і тэрытарыяльным, і прасторавым, і часавым. Андрэй Кудзіненка прапанаваў свой варыянт — постмадэрнісцкі сцёб у фільме «Акупацыя. Містэрыі». Трэцяя навэла з яго закранула балючую праблему беларускага этнасу — паступовае знікненне мужчыны, бацькі.

### РОДАМ З ДЗЯЦІНСТВА

— Ваенныя фільмы амаль заўсёды звязаныя з тэмай дзяцінства, — гэта наша асаблівасць. «Іван Макаравіч», лепшы фільм Дабралюбава, «Праз могілкі» Турава — падлетак галоўны герой. Яно карысталася попытам не толькі на савецкім экране, але і ў Еўропе. Фільм «Дзяўчынка шукае тату» — быў лідарам у кінапракаце некалькі гадоў. Але наша дасягненне — дзіцячае прыгодніцкае кіно. Прыклад — фільмы Льва Голуба, знятыя сумесна з еўрапейскімі вытворцамі. Потым на іншым этапе з'явіўся Леанід Нячаеў, які на «Беларусьфільме» стварыў знакамітыя першыя тэлемюзіклы ў Савецкім Саюзе. На жаль, напрыканцы 80-х рэжысёр з'ехаў у Маскву. Нячаеў праклаў сцяжынку — універсальных па тыпажы персанажаў з песенькамі на цудоўныя мелодыі, але хутчэй агульнага еўрапейскага кантэксту.

Да гэтага звярнулася на сучасным этапе Алена Турава, зняўшы «Навагоднія прыгоды ў ліпені». Дзецям фільм падабаецца, але я знаходжу там недахопы — кліпавая форма, недасканалая камп'ютарная графіка. Наступны яе фільм будзе ў жанры «фэнтэзі» — дзяўчынка з рудымі валасамі падарожнічае ў прасторы. Ёсць надзея, бо Турава — шчыры рэжысёр. Але наўрад ці ў дзіцячым кіно мы пабачым нешта роднае — напрыклад, экранізацыю беларускіх казак.

### КНІЖНІКІ

— У кіно шмат ідзе ад сцэнарыя. Беларускае кіно літаратурацэнтрычнае, звязанае з вербальным тэкстам, з экранізацыямі, з тым, каб у сцэнарыі ўсё было прапісана. Хоць насамрэч кіно можа базіравацца і на палове старонкі тэксту. Дзве добрыя традыцыі цягнуць наша кіно — псіхалагізм з меладраматызмам і літаратурацэнтрызм. А трагедыйнае светаадчуванне нашаму кіно не ўласцівае, у адрозненне ад беларускай нацыі як такой. У былыя часы гэта было звязана з ідэалагічнымі падыходамі, таму карціна «Ідзі і глядзі» з цяжкасцю прабівалася да гледача. Яе падтрымаў сам Машэраў.

Трагедыя як жанр у нас увогуле не прывілася. Ад такой аблегчанасці таксама растуць ногі праблем у нашым кіно. Фільм «Кадэт», які выйшаў у гэтым годзе, Віталь Дудзін спрасціў. Таму атрымалася традыцыйная меладраматычная гісторыя, хоць расповед пра пасляваенных лясных братоў мог бы ўзняцца да ўзроўню разважанняў пра чалавечую варожасць. Нам увесь час трошкі-трошкі не хапае. Так жа з «Інсайтам». Мы, калі чыталі сцэнарый, узрадаваліся, што ўпершыню ад меладрамы перайшлі да нейкіх экзістэнцыйных матываў. Тэма і праблематыка ўзроўню антычнай трагедыі, але вырашана яна так, як дазволіла сабе рэжысёр, якая дагэтуль працавала цудоўна ў дзіцячым кіно. Але «Інсайт» я разглядаю як выпрабаванне нейкіх новых сэнсавых тэрыторый для беларускага кіно. І тут трэба адзначыць сцэнарый Алёны Калюновай, хоць ён ляжаў у яе больш за 10 гадоў...

Дарэчы, 20 гадоў адляжаў сцэнарый фільма «Ваўкі» (прэм'ера адбудзецца 17 снежня — **Аўт.**). Аляксандр Чакмянёў яго выпакутаваў. Ён пра расійскія рэаліі, якія спалучаюцца з нашай гісторыяй. Я лічу, што ён валодае этнічнай ідэнтычнасцю і самабытнасцю. Не толькі па прыродзе, пейзажы, хатах, але і па характарах людзей. Яго можна назваць трагедыяй, якая ўздымаецца да ўзроўню прытчы пра пасляваенны час. Падымаецца тэма ўлады і страху чалавека. Гэты фільм можна назваць нашым дасягненнем за апошні час, гэта кіно для гледача, які шукае сэнс і мастацкае наталенне ў стужках.

Трэба прызнаць, што шмат якія з выдатных нашых фільмаў былі зроблены з расійскімі сцэнарыстамі. Адно з нашых балючых месцаў — недахоп сваіх сцэнарыстаў, кінадраматургаў. У той жа час найбагацейшым скарбам з'яўляецца сама беларуская літаратура — таго ж Караткевіча чытаць-неперачытаць. Няўжо рэжысёры гэтага не адчуваюць?

### КАДРЫ ВЫРАШАЮЦЬ

— Цяпер у нас ускладваюць надзеі на тры «К»: Колбышаў, Кудзіненка, Канановіч. Яны папрацавалі на студыях расійскіх, вярнуліся з досведам. Але могуць быць і запрошаныя рэжысёры. Адзін з варыянтаў — Аляксандр Міндадзе, які хоча здымаць сам паводле свайго ж сцэнарыя, прысвечанага чарнобыльскай трагедыі. Вельмі пачуццёвы, фактурны матэрыял. Але ці зацікавіць гэты сцэнарый Беларусь?.. Ёсць добры сцэнарый Людмілы Дуброўскай «Ефрасіння Полацкая». Вялася размова пра тое, што яе мастацкім кіраўніком на гэтым фільме будзе Валерый Рубінчык. Магчыма вяртанне майстра, які на мой погляд, цікавы менавіта ў галіне кінамовы. Гэта велічыня еўрапейскага маштабу, мастак, у якога можна павучыцца.

### КІНАШКОЛА

— Для яе патрэбна некалькі складальнікаў. Традыцыі ў нас ёсць — цудоўныя майстры ў мінулым, фільмы. Але, акрамя гэтага, патрэбная навучальная ўстанова. Таму спадзяванне на адкрыццё ў 2010 годзе кінафакультэта ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Там плануецца падрыхтоўка сваіх сцэнарыстаў (кінадраматургаў), якія будуць мець стасункі з калегамі — рэжысёрамі, аператарамі, бо вельмі важны прафесійны асяродак, у якім «варышся». Прадугледжваецца запрашэнне майстроў з ВГІК, з іншых краін, каб пашырыць культурную прастору. Патрэбны погляд збоку, эксперты, якія б маглі ацаніць нашу культуру з пазіцыі іншых, адчуць тое зерне, якое адрознівае менавіта беларускі светапогляд. І на падставе яго нешта ствараць, каб было зразумела, што гэта кіно нашай краіны.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## НАШ ГЛАБАЛЬНЫ ЭКШН



Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА.

**Беларускі «Снайпер» цэліць у рэйтынгі з дапамогай Дзмітрыя Пяўцова.**

Працэсы глабалізацыі ў сучасным экранным працэсе азначаюць імклівае расшырэнне масавай культуры, сціранне і знішчэнне нацыянальна-этнічных асаблівасцяў кіно розных краін. Гэтыя з'явы прыйшлі ў беларускае кіно. Ярчэй за ўсё яны праяўляюцца ў найбольш папулярным і масавым жанры экшн (так сёння называюць баевікі).

У жанры экшн стварыў свой апошні буйны фільм «У жніўні 44-га» Міхаіл Пташук, сталы, прызнаны майстар напоўненай моцнымі пачуццямі кінадрамы. Іншыя прадстаўнікі старэйшага рэжысёрскага пакалення — В. Нікіфараў, А. Яфрэмаў, А. Франскевіч-Лае — перакваліфікаваліся на моцна скалочаныя «мужчынскія» баевікі, многасерыйныя экшн аб снайперах і замахах.

Аляксандр Франскевіч-Лае, выхаванец беларускай ВНУ, які жыве ў Германіі, рэалізаваў «альтэрнатыўны» гістарычны экшн, у якім агульнавядомыя падзеі беларускай гісторыі развіваюцца не так, як гэта было насамрэч, а згодна з фантазійнымі пажаданнямі аўтараў.

Так званае «маладое пакаленне» (хоць ім каля 40 гадоў), выпускнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, адразу ж пачалі здымаць у жанры экшн. Андрэй Голубеў — былы каскадзёр, і персанажы вайны ў яго стужках дзейнічалі, як цыркавыя акцёры, — бегалі, скакалі, пераварочваліся, як акрабаты пад купалам цырка.

Дзяніс Скварцоў, які атрымаў за мяжой адукацыю як дызайнер, перанёс свае прыхільнасці на фільм аб рэальнай вайне, якую ён уяўляў сабе як серыю камп'ютарных місій. Героі яго кліпава-камп'ютарных стужак дзейнічалі, як персанажы шматлікіх гульняў, — яны імкліва праходзілі «місію за місіяй», стралялі, забівалі, захопліваць «жыццёвую прастору» працаўніка. Пры гэтым не важныя былі іх мэты і маральныя матывы дзеяння. Такім чынам, Андрэй Голубеў і Дзяніс Скварцоў сталі экраннымі «ідэолагамі» «гульні ў вайнушку».

Адваротны бок глабалізацыі экрана — нівеліраванне аж да знішчэння ўласнай, айчыннай нацыянальнай культуры. Гэту з'яву можна бачыць на прыкладзе лёсу Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». Галоўныя ролі ў экшн выконваюць акцёры-«фішкі» расійскага кіно — Дзмітрый Пяўцоў (з серыяла ў серыял у Яфрэмава), Сяргей Бязрукаў у Франскевіча-Лае. Паколькі дзеянне ў гэтых экшн ніяк не звязана з гісторыяй і культурай Беларусі, а аўтарам трэба неяк згадаць аб этнічных беларусах, яны ўводзяць сімвалічныя назвы персанажаў: «беларусачка» (яна ж снайперка-ведзьма, як называюць яе акупанты). Адначасова сцвярджаецца, што Беларусь наогул — край ведзьмаў, яны тут за кожным дрэвам у лесе. Калі гаворка ідзе пра беларускага салдата, які змагаецца не ў шэрагах сваіх землякоў, яго называюць шматзначна «беларус». Адначасова ўзгадваецца, што ён з нажом хадзіў на паляванне на мядзведзя. А ў вайну з гэтым жа нажом нападае на акупанта — як паляўнічы...

Званне «Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» мае на ўвазе і абавязвае ствараць (акрамя серыйных экшн) буйныя нацыянальныя кінапраекты аб гістарычных фігурах, значных падзеях у гісторыі роднай Айчыны. Інакш гэта назва — «пусты гук». У беларускім кіно ніяк не рэалізоўваюцца нацыянальныя кінапраекты, якія маглі б быць створаныя (пры жаданні і намаганнях) як экранізацыі ўнікальных, цудоўных паэм Якуба Коласа «Новая зямля» (дзе сцвярджаюцца важныя для беларускага менталітэту каштоўнасці працы, сям'і, любові да роднай прыроды) і «Сымон-музыка», дзе таленавіта і яскрава паказаны скрыпач, музыкант-самародак, які бачыць прыроду як жывую істоту. Гэтыя нацыянальныя кінапраекты маглі б садзейнічаць сцвярджэнню пазітыўнага іміджу беларускага народа ў глабальнай экраннай прасторы. Іншыя кінематаграфіі на пасляsavецкай экраннай тэрыторыі паклапаціліся аб сваім іміджы, аб'яднаўшы ў фільмах рэальную гісторыю і міф: казахскі фільм-копрадукцыя «Качэўнік» Сяргея Бадрова аб нацыянальным асілку і краіне Казахіі. Варта ўспомніць, што «Качэўнік» ствараўся метадам копрадукцыі, і ў напісанні сцэнарыя ўдзельнічалі такія асы «кінадраматургіі», як Рустам Імбрагімбекаў, Мілаш Форман. У Расіі створаныя фільм-паэма, фільм-быліна «Тарас Бульба» паводле аповесці М. Гогаля і фільм-легенда «Аляксандр» (пра Аляксандра Неўскага). Падобныя гісторыка-міфалагічныя кінапалотны на Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» упарта не ствараюцца.

Паказальны экранны лёс не-пастаноўкі фільма «Ефрасіння Полацкая» рэжысёра Людмілы Дуброўскай паводле яе сцэнарыя. Сцэнарый аб найбуйнейшай, знакавай фігуры беларускай гісторыі і культуры шматразова абмяркоўваўся ў вельмі кваліфікаваным асяродку — у Беларускім экзархаце, у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, у ІМЭФ НАН Беларусі. І ўсюды быў падтрыманы. Аднак на пастаноўку фільма не выдзяляецца бюджэтных сродкаў, паколькі яны ідуць на серыялы-«стралялкі».

Беларуская экранная культура ў цяперашні час практычна страціла плённыя гуманістычныя традыцыі айчыннага кіно мінулых дзесяцігоддзяў. Беларускае кіно можа знікнуць з сусветнага кінапрацэсу як самабытная мастацкая з'ява, а гэта можа негатыўна адбіцца на будучыні народа, які страціў важную частку сваіх мастацкіх дасягненняў і этычных каштоўнасцяў.

**Вольга НЯЧАЙ, доктар мастацтвазнаўства, прафесар.**

## ВАШ ПРАЕКТ!..

### Увайсці ў гісторыю кіно можа кожны, хто прапануе цікавую тэму фільма

Прапаноў у выглядзе сінопсісаў, анатацый альбо сцэнарных матэрыялаў чакаюць у Дэпартаменце па кінематаграфіі Міністэрства культуры. Іх можна дасылаць па электроннай пошце: dep-kino@kultura.by.

Такім чынам творчыя людзі Беларусі і розных краін (конкурс адкрыты) могуць прычыніцца да планаў нашай краіны па здымках ігравых, дакументальных і анімацыйных фільмаў.

Чаго чакаць ад конкурсу, распавёў Андрэй Мікалаевіч Бычкоў, які выконвае абавязкі кіраўніка Дэпартамента па кінематаграфіі.

**— Чаму ў нас гэтую справу вырашыў узяць на сябе Дэпартамент па кінематаграфіі пры Міністэрстве культуры?**

— Дэпартамент па кінематаграфіі падключаецца да пошуку тэм і прапаноў на здымкі фільма, таму што мы зацікаўлены: наша фільмапрадукцыя павінна быць запатрабаваная, гэта значыць, павінен быць альбо палітычны эфект — перамогі на прэстыжных фестывалях, альбо адпаведна з'яўляцца фільмы з фінансавай аддачай. Фільмы павінны быць даступныя для прагляду не толькі ў кінатэатрах рэспублікі, тэлеканалах, але і ў гандлёвай сетцы, асабліва наша мультыплікацыя.

— Які будзе механізм працы з прапановамі?

— Сцэнарныя матэрыялы альбо сінопсісы, якія спадабаюцца, мы будзем разглядаць на экспертным савеце, у склад якога ўваходзяць прафесіяналы кіно і крытыкі. І калі ідэя падасца перспектыўнай, то можна перайсці да стварэння гатовага сцэнарыя, які будзем прапаноўваць таленавітаму рэжысёру. Безумоўна, гэта патрабуе часу. Але прыкладна па такой схеме працуюць у «Галівудзе» — толькі яны збіраюць матэрыял з усяго свету. Прадзюсарскія цэнтры купляюць сцэнарый, дапрацоўваюць і рэалізуюць. І наш адкрыты конкурс ідзе ў гэтым жа рэчышчы.

**— Якім чынам прыйшлі да гэтай думкі?**

— Магчыма, прыйшоў час зразумець, што пазіцыя чакання не прывядзе да поспеху, асабліва, калі на кінастудыі «Беларусьфільм» і ў «Беларускім відэацэнтры» існуюць праблемы са сцэнарным партфелем. На жаль, кінавытворчыя прадпрыемствы прымаюць да разгляду толькі гатовыя сцэнарыі. Але цікавая тэма можа ўзнікнуць на ўзроўні ідэі, якую потым можна дапрацаваць з рэдактарам, давесці да ўзроўню сцэнарыя. Па-сутнасці кінапрадпрыемствы павінны быць зацікаўлены ў рэалізацыі кінапраектаў, яны павінны шукаць, як ва ўсім свеце робяць студыі, якія ў рынкавых умовах імкнуцца да таго, каб іх загружалі па поўнай праграме. І зарабляць на гэтым грошы.

**— Ці будзеце працаваць разам з «Беларусьфільмам» у выбары тэмаў для кіно? Бо ў асноўным кінапраекты будуць рэалізоўвацца там.**

— Безумоўна, мы працуем разам з кінастудыяй. І ёсць вынік: усё больш фільмаў ствараецца пры сумеснай вытворчасці з Расіяй, дзякуючы міждзяржаўным пагадненням. У планах — выйсці на еўрапейскі рынак вытворчасці, каб маглі ўдзельнічаць прадстаўнікі іншых краін, з якімі ў нас адзіная культурная прастора. Але натуральна, найперш трэба падтрымліваць сваіх кінематаграфістаў.

> **«Цяпер у краіне такое заканадаўства, што мы не маем права заказваць сцэнарыі. Мы можам працаваць толькі з гатовымі сцэнарыямі, а грошы аўтар атрымае толькі тады, калі фільм запускаецца ў вытворчасць».**
>
> *Галоўны рэдактар нацыянальнай кінастудыі Наталля СЦЯЖКО*

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

